Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Органа Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. • 3 • — 2 р. 70 к. • 6 • — 4 р. — к. • 1 год — 8 р. — к. Замена адрасу іншагародняй — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шпальтовага пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шпальтовага пасьперад тэксту 1 р. — к. За радок шпальтовага поруч тэкстам 1 р. 50 к. Сьцешныя на 50 проц. даражэй. Зьвы тэрміну барацьбы 10 проц. надбаўкі.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: Зь 1 дакумэнту — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 •. Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумэнт — 15 •. За кожны дадатковы — 5 •. Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 75 (2564) Чацьвер, 4-га красавіка 1929 г.

ЧАРГОВЫ ПЛЕНУМ ЦКК КП(б)Б АДЧЫНЯЕЦЦА 6-ГА КРАСАВІКА 29 Г. А 10 Г. РАНІЦЫ Ў ПАМЯШКАНЬНІ ЦКК КП(б)Б (САВЕЦКАЯ, 55) З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЮ:

1. АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ЧЫСТКІ САВ. АПАРАТУ (ДАКЛАД. ТАВ. РЫСЬКІН).

2. АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ЧЫСТКІ ПАРТЫІ. (ДАКЛ. Т. ЛЯЎКОЎ).

3. БАРАЦЬБА З БЮРАКРАТЫЗМАМ І РАБОТА БЮРО СКАРГАЎ. (ДАКЛ. ТАВ. ЛУБУЖ).

4. РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ ВЫТВОРЧАСЬЦІ І ЗНІЖЭНЬНЕ САБЕКОШТУ. (ДАКЛ. ВСНГБ І САДАКЛАД. ТАВ. РАКАВА)

СТАРШЫНЯ ЦКК КП(б)Б КАЛНІН.

ДА ЧЫСТКІ САВЕЦКАГА АПАРАТУ.

МАСКВА, 3-4. ЦК саюзу Савецкіх і гандлёвых служачых вызначыў, што ў савецкім і кааперацыйным апараце ня маюць права працаваць ранейшыя абшарнікі, капіталісты, ранейшыя чыноўнікі царскага і белых урадаў, а таксама асобы, скажаючыя савецкія законы, бюракраты, растратчыкі і г. д.

Аднак, з савецкага апарату не павінны мэханічна звальняцца асобы хоць і паходзячыя з сацыяльна-чужых груп, але выказаўшыя сябе на савецкай працы, як добрасумленныя, адданыя савецкай уладзе працаўнікі. Праверка савецкага апарату і выключэньне з яго варожых пралетарыяту элемэнтаў будзе праводзіцца органамі РСІ пры ўдзеле шырокай пралетарскай грамадзкасьці і прафсаюзаў.

ЦК саюзу савецкіх і гандлёвых служачых лічыць, што праверка павінна праводзіцца ўсюды зусім адкрыта.

ЦК саюзу савецкіх і гандлёвых служачых падкрэсьлівае, што для пасьпяховага правядзеньня праверкі дзяржаўнага апарату неабходна, папершае, не дапускаць новага забруджаньня апарату шляхам паўторнага прыёму ўжо звольненых пры праверцы асоб, і, падругое, загадзя распачаць падрыхтоўку працаўнікоў для замяшчэньня вычышчаных з апарату працаўнікоў.

Да гэтае пары справа вылучэньня рабочых на савецкую працу пастаўлена далёка нездавальняюча. Паміж тым, савецкі апарат можа прыцягнуць на савецкую працу рабочых з ліку членаў сэкцыі савету, удзельнікаў абсьледваючых груп РСІ, членаў вытворчых камісій і нарад і г. д. Неабходна таксама ўнутры ўстаноў вылучаць найбольш здольных нізавых служачых на вышэйшую працу.

СТАНОВІШЧА Ў АЎГАНІСТАНЕ НА АЎГАНА-ІНДЫЙСКАЙ МЯЖЫ.

ДЭМАНСТРАЦЫІ СУПРОЦЬ АНГЕЛЬЦАЎ. АНГЛІЯ РЫХТУЕЦЦА ДА НОВАЙ ПРАВАКАЦЫІ.

ЛЁНДАН, 2-IУ. «Дэйлі Тэлеграф» зварочвае ўвагу на становішча, якое стварылася на Паўночна-Заходняй мяжы Індыі ў зьвязку з вайной паміж Афрыдзі і шэйтамі. Пэшаварскі карэспандэнт газэты паведамляе, што ваенныя дзеяньні пачаліся 28 сакавіка.

«Калі—піша карэспандэнт—сунітам удасца адціснуць шэйтаў на тэрыторыю, якою кіруюць ангельцы, дык ангельцам прыдзецца ўмяшацца, бо пляменная варожасьць на тэрыторыі пад брытанскім сьцягам рэч недапушчальная. З гэтае прычыны гарнізон Кодтата прыведзен у баявую гатоўнасьць, робіцца паветраная разьведка ва разьвіцьцём падзей пільна сочаць».

Карэспандэнт дадае, што прапаганда каліфацкіх арганізацый у карысьць Аманулы згусьціла атмасфэру. Нэйтральнасьць Англіі ў адносіне да Аўганістану тлумачыцца, водгук слоў карэспандэнта, як адзнака слабасьці і варожасьці да Аманулы.

У Пэшавары адбылася вялікая дэманстрацыя супроць былога ангельскага паслаўніка ў Кабуле Дэмфрыса. Дэманстранты палілі чужаземную мануфактуру ў адзнаку вынявагі да Англіі. «За кулісамі гэтае кампаніі—піша карэспандэнт—відаць рука Масквы».

Кандагарскае бюро друку вядзе актыўную прапаганду ў карысьць Аманулы, а бальшэвіцкія арганізацыі Індыі далучыліся да гэтае кампаніі.

Тая акалічнасьць, што робіцца спроба ўзбудзіць варожасьць паміж пляменамі ў зонах Урула, Кагата, Хайбэра, Іраха і Ходжа падказвае меркаваньне, што за сцэнаю дзейнічае Расея, якая імкнецца зачыніць індыйскую граніцу. Што індыйскі ўрад разумее сур'ёзнасьць становішча, відаць ходзь бы з апошняй аблавы на чырвоных агэнтаў у Індыі. Гэта мера можа ўнесьці неблагасьлоўнасьць у прыгранічным райёне. Бязбоязная і цьвёрдая палітыка ў райёнах, заселеных качэўнікамі, павінна папярэдзіць паўстаньні і пляменную варожасьць на Паўночна-Заходняй мяжы Індыі».

Гэтыя спробы «Дэйлі Тэлеграф» зьвязаць савецкі ўрад з падзеямі ў Аўганістане і Індыі даюць сур'ёзныя падставы думаць, што паведамленьні Пэшаварскага карэспандэнта газэты інсьпіраваны. Магчыма, што гэта тлумачэньне фактаў, у прыватнасьці адносін СССР да інда-аўганскіх падзей, павінны паслужыць [прадлодзіцьі да растрэлу арыштаваных індаўна дзеячоў рабочага руху ў Індыі і даць, апроч таго, каштоўны з ангельскага пункту гледжаньня, матар'ял для кансэрватыўнае прапаганды перад парлямэнцкімі выбаркамі.

ПРАСОЎВАНЬНЕ АМАНУЛЫ-ХАНА.

ЛЁНДАН, 2-4. Водлуг паведамленьняў «Дэйлі Тэлеграф», Аманула павольна пасоўваецца на Кабул. Да 20 красавіка Аманула разьлічвае быць у Эхавіі.

ШОСТЫ ЗЬЕЗД ФРАНЦУСКАЕ КАМПАРТЫІ.

ПАРЫЖ, 2-4. У нядзелю, у прадмесьці Парыжу Сэн-Дэні адчыніўся 6-ы зьезд французкае кампартыі пры ўдзеле каля 150 делегатаў. Памяшканьне мясцовага муніцыпалітэту, кіруемага камуністамі, дзе адчыніўся пасяджэньні зьезду, абкружана ўзмоцненымі нарадамі паліцыі. Зьезд адчыніўся ўступнаю прамоваю Манмусе, які зазначыў, што зьезд адбываецца ў абставінах новае хвалі шавіністычнае кампаніі, якая ахапіла ўсю Францыю і мае на мэце падрыхтаваць новую імпэрыялістычную вайну і ўзмацненьне рэпрэсій супроць камунізму.

Французская кампартыя проці прымірэнцтва.

ПАРЫЖ, 2-4. На зьезьдзе французкае кампартыі заслухан даклад Брансона аб міжнародным становішчы. Дакладчык сказаў, што падзеі з часу 6-га кангрэсу Камінтэрну пацьвердзілі аналіз пасьляваеннага разьвіцьця капіталізму, які зьмяшчаецца ў пастановах кангрэсу. Ня гледзячы на гэта, у партыі ёсьць асобы, якія на словах згаджаюцца з пастановамі Камінтэрну, але на практыцы робяць усялякія агаворкі ў адносінах канкрэтнага становішча. Дакладчык зазначае далей, што правая небясьпека ў Францыі выяўляецца галоўным чынам у бязьдзейнасьці і ў дрэнным падрыхтоўцы да кіраўніцтва стачачнымі выступленьнямі. Неабходна змагацца з усімі ўхіляючымі ад партыйнае лініі ў практычнай рабоце, а таксама з усімі прымірэнцамі. Зварочваючыся да Дорыё, Брансон заклікае яго, паколькі ён зразумеў свае памылкі, павесьці сумесна з партыяй барацьбу супроць правага ўхілу ў штодзённым жыцьці, і не адыгрываць ролі прымірэнца, як гэта было на акруговай партыйнай канфэрэнцыі Паўночнага вокругу. Брансон канчае свой даклад заклікам зьнішчыць супольнымі сіламі апартунізм у шэрагах французкае кампартыі.

Адчыніўся 4-ы кангрэс нямецкага КСМ.

БЭРЛІН, 2-4. У нядзелю 31-га сакавіка адбылося адчыненьне 4-га кангрэсу нямецкага саюзу камуністычнае моладзі. Перад адчыненьнем кангрэсу адбылася дэманстрацыя 60 тысяч рабочых. З іншых частак Нямеччыны прыбыло звыш 15 тысяч маладых рабочых, у тым ліку з Усходняе Прусіі, Верхняе Сілезіі, Баварыі і Гальштыніі. Працэсыя абярнулася ў магутную дэманстрацыю супроць Гражэінскага, супроць рэпрэсій, ужываемых у адносіне да рэвалюцыйнага руху моладзі і за рэвалюцыйную барацьбу супроць імпэрыялісцкае вайны і ў абарону СССР. Сустрэчаны гучнымі воплескамі т. Тэльман перадаў кангрэсу прывітаньне ад цэнтральнага камітэту камуністычнае партыі Нямеччыны і ад цэнтральнага камітэту чырвонага саюзу франтавікоў. Дэманстрацыя дзякуючы дысцыпліне маніфэстантаў адбылася без сур'ёзных сутычак.

Арышт дэпутата польскага сойму.

ВАРШАВА, 2-4. У Варшаве арыштаваны [illegible] аб'яднаньня сельробу Вайніцкі, пасля чаго пазбаўлены дэпутацкае недатычнасьці.

Рабочыя мабілізуюць сілы проці фашызму.

(Усеаўстрыйскі анты-фашысцкі зьезд).

Цэнтральны анты-фашысцкі камітэт у Аўстрыі, у які ўваходзяць прадстаўнікі пралетарскіх арганізацый і буйных прамысловых прадпрыемстваў, пастанавіў склікаць 21-га красавіка г. г. у Санкт-Пэльтэне, прамысловым цэнтры Ніжняе Аўстрыі, усеаўстрыйскі анты-фашысцкі зьезд. Задача зьезду—утварыць арганізацыйныя прадпасылкі для пашырэньня базы аўстрыйскае рабочае клясы ў барацьбе супроць прасоўваньня фашызму. Па ініцыятыве цэнтральнага анты-фашысцкага камітэту ўжо арганізаваны камітэты ў 20 мясцох. На зьезд запрошаны таксама пралетарскія арганізацыі і прадпрыемствы, якія ня мелі да гэтага часу прадстаўнікоў у анты-фашысцкім камітэце.

У процівагу анты-фашысцкаму зьезду фашысты пастанавілі наладзіць 5-га мая ў тым-жа Санкт-Пэльтэне грандыёзную дэманстрацыю хэймвэраў з усяе Аўстрыі. У дэманстрацыі павінны ўзяць удзел 30-40 тысяч чалавек. Частка ўдзельнікаў дэманстрацыі з маўклівага дазволу ўлады будзе ўзброєна.

Апошнія фашысцкія дэманстрацыі ў Вінэр-Пэйштадце і ў шэрагу іншых прамысловых прыгарадаў Вены, а таксама працэсія ў Санкт-Пэльтэне зьяляюцца зьвеньнямі аднаго ланцугу. Мэта іх—абкружыць рабочую клясу Вены фашысцкіч колам і распачаць паход супроць ящчэ ўцалеўшых крохаў заваёў пралетарыяту. Сацыял-дэмакратычнае кіраўніцтва выказвае поўную пасыўнасьць у справе барацьбы супроць наступу фашызму і накіроўвае ўсе сілы да таго, каб утрымаць рабочых ад барацьбы з ім. Адзіна кампартыя і арганізаваныя пад яе кіраўніцтвам анты-фашысцкія камітэты, аб'яднаючыя шырокія рабочыя масы бяз розьніцы партыйнае прыналежнасьці, вядуць рашучую барацьбу супроць фашызму. На зьезьдзе 21 красавіка і будзе арганізован шырокі адзіны пралетарскі абаронны фронт супроць фашызму.

ПАДЗЕІ Ў КІТАІ АБВАСТРАЮЦЦА.

Мукдэнцы рыхтуюць войска.

ХАРБІН, 2-4. Мукдэнцы ня спыняюць канцэнтраваць войска ў райёне Шанхай-Гуаню. У прэсе гэта матывуецца неабходнасьцю абараняць недатычнасьць межаў Манчжурыі, у зьвязку з падзеямі ў Кітаі. Мукдэнскія лідэры заяўляюць, што падзеі ў Хубэі не адаб'юцца на становішчы 3-х усходніх правінцый, якія застаюцца лёяльнымі ў адносіне да нанкінскага ўраду. Лідэры запэўняюць, што ў сувязі з сканчэньнем зьезду Гаміндану, у 3-х усходніх правінцыях будзе дапушчана арганізацыя 3-х партыйных аддзелаў. Гэтым запэўненьням, аднак, супярэчаць весткі аб перамовах мукдэнцаў з прадстаўнікамі гуансійцаў, аб перакіданьні войска па Пекін-Мукдэнскай чыгунцы, а таксама і аб тым, што фактычна заснаваньне гаміндананўскіх арганізацый у Манчжурыі не дапушчаецца.

Крывавы тэрор у Кантоне.

ЛЁНДАН, 2-4. Гонконгскі карэспандэнт «Таймс» паведамляе, што ў Кантоне пакараны сьмерцю сотні людзей па падозраньню ў камунізьме. «Многія з пакараных сьмерцю—заўважвае карэспандэнт—ня мелі мабыць ніякіх адносін да камунізму».

Супроць уступак Японіі.

ПЭЙПІН, 2-4. Водлуг паведамленьня «Цзянцзінь-І-Шы-Бао» пэйпінскае анты-японскае таварыства востра ганьбіць нядаўна падпісаную япона-кітайскую згоду аб пагоджаньні цзынаньскага інцыдэнту. У рэзалюцыі, ухваленай таварыствам, Ван-Чжэн-Цін (міністр замежных спраў нацыянальнага ўраду) называецца «здраднікам бацькаўшчыны» за тое, што падпісаў гэтую згоду.

Японскія міністры супроць эвакуацыі Шандуня.

ТОКІЁ, 2-4. Як паведамляе агэнцтва Сымбун-Рэнга на сёньнешнім пасяджэньні габінэту некаторыя міністры выказвалі суменьне ў магчымасьці хуткае эвакуацыі Шандуню японскім войскам, з прычыны пагрозы ваеннай сутычкі паміж Фын-Юй-Сянам, Чан-Кай-Шы і Чжан-Цзун-Чанам на тэрыторыі гэтае правінцыі пасьля японскае эвакуацыі.

КАМБІНАЦЫІ РУМЫНСКАГА МІНІСТРА.

ПАРЫЖ, 2-4. Міністр замежных спраў Румыніі Міранэску, які знаходзіцца ў Парыжы, даў гутарку аб унутранай і замежнай палітыцы румынскага ўраду. Спыніўшыся на румынска-савецкіх узаемаадносінах, Міранэску заявіў: «зразумела, маскоўскі пратакол не азначае, што Масква фармальна прызнала далучэньне Бэсарабіі да Румыніі, але мы ня маем падстаў дамагацца фармальнага прызнаньня. Для нас досыць, што Румынія ўладае Бэсарабіяй на праву і фактычна. Маскоўскі пратакол мае вялікае практычнае значэньне, паколькі савецкі ўрад фармальна адмовіўся ад ажыцьцяўленьня вайсковай сілай сваіх прэтэнзій, якія фактычна ня існуюць». Далей Міранэску заявіў, што яго падарожжа ў Варшаву дазваляе ящчэ раз пацьвердзіць саюз паміж Польшчаю і Румыніяю. Пры гэтым Міранэску заўважыў, нібы яго прыезд у Варшаву—першы крок на шляху да зьмяненьня новае групоўкі Румыніі і Польшчы. Румынскі ўрад, заяўляе Міранэску, лічыць, што саюз з Польшчаю не перашкаджае Румыніі прымаць удзел у Малой Антанце. Калі ўжо гаварыць аб новых камбінацыях, дык яны маглі-б вынікнуць у пашырэньні Малай Антанты шляхам уключэньня ў яе Польшчы

Самайловіч і Чухноўскі ў Бэльгіі.

ПАРЫЖ, 2-4. Выступленьне Самайловіча і лётчыка Чухноўскага, наладжанае ў Брусэлі групай левых літаратараў, адбылася в вялікім посьпехам. Заля, у якой адбываліся даклады, не магла ўмясьціць усіх жадаючых прысутнічаць.

Рэфармісты „ганьбяць"

ЛЁНДАН, 2-4. Канфэрэнцыя незалежнае рабочае партыі ўхваліла рэзалюцыю, якая ганьбіць узмацненьне рэпрэсій ў Індыі. У гэтай рэзалюцыі партыя бярэ на сябе абавязацельства дамагацца самавызначэньня для Індыі, і змагацца за эканамічнае вызваленьне індыйскіх мас.

РОСТ НАШАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

Голас дэлегацыі ангельскіх прамыслоўцаў.

МАСКВА, 2-4. 1-га красавіка, 30 членаў ангельскае дэлегацыі, прадстаўляючыя ангельскую машынабудаўнічую прамысловасьць наведалі ўсесаюзны машына-тэхнічны сындыкат. Дэлегацыя была прынята спэцыяльнай камісіяй па вядзеньні перамоў у галіне машынабудаўніцтва, на чале з старшынёю камісіі, старшынёю праўленьня ВМПС тав. Н. Д. Канюховым. Адчыніўшы пасяджэньне, т. Канюхоў азнаёміў дэлегацыю з разьвіцьцём савецкае прамысловасьці. Ад імя дэлегацыі выступіў Мэткальф. Ён зазначыў, што паведамленьне Канюхова аб становішчы і разьвіцьці саюзнае прамысловасьці зрабіла на дэлегацыю вялікае ўражаньне. Патрэбнасьці Саюзу настолькі вялікія, што прысутнічаючыя тут прадстаўнікі розных ангельскіх фірмаў зусім не павінны баяцца канкурэнцыі, бо заказаў будзе даволі для ўсіх зацікаўленых у гэтым фірмаў. У той жа дзень адбыўся прыём, на якім прысутнічалі ўсе члены ангельскае дэлегацыі, прадстаўляючыя машынабудаўнічую прамысловасьць. Член ангельскае дэлегацыі Мэткальф дзякаваў ад імя дэлегацыі за добры прыём і, зазначыўшы на шкоду, учыненую разрывам дыплёматычных зносін, адзначыў, што дзелавыя перамовы могуць пачацца пасьля таго, як будзе падпісана здавальняючая эканамічная згода. Мэткальф выказаў надзею, што гэтыя перамовы дадуць станоўчыя вынікі. Некалькі членаў дэлегацыі агледалі маскоўскія лекавыя ўстановы і больніцы. Апрача таго члены дэлегацыі наведалі Дзяржгандаль, Сындыкат каляровай мэталургіі, акцыянэрнае т-ва «Электраімпарт» і інш.

Амэрыканская тэхніка ў савецкай электрапрамысловасьці.

МАСКВА, 2-4. Гэтымі днямі вярнуўся з Амэрыкі намесьнік старшыні праўленьня ГЭТ'у т. Філімонаў, падпісаўшы ад імя трэсту дагавор аб тэхнічнай дапамозе з буйнейшай амэрыканскай фірмай «Інтэрнэйшэн Жэнэраль Электрык».

Дагавор,—паведаміў т. Філімонаў,—распаўсюджваецца на ўсё наша электра-машынабудаўніцтва і кабельную вытворчасьць і прадугледжвае выкарыстаньне ўсіх патэнтаў фірмы і апошніх яе тэхнічных дасягненьняў. ГЭТ мае права камандыраваць на прадпрыемствы „Жэнэраль Электрык" 15 сваіх інжэнэраў для вывучэньня адпаведных вытворчасьцяй і павышэньня сваёй кваліфікацыі.

З другога боку, фірма абавязваецца паслаць у СССР сваіх інжэнэраў-кансультантаў для распрацоўкі асобных пытаньняў арганізацыі нашае электрапрамысловасьці і пастаноўкі новых вытворчасьцяй. У цэлым трэба сказаць, што ажыцьцяўленьне дагавору паставіць нашу электрапрамысловасьць на ўзровень заходня-эўрапэйскае і амэрыканскае тэхнікі.

У Саюзных Рэспубліках.

1-ы пленум новаабранага Массавету.

МАСКВА, 2-4. Адбыўся ўрачысты пленум новаабранага Массавету. Пленум адзначыў абраў старшынёю Массавету т. Уханава.

З прывітаньнем новаму складу Массавету выступіў, сустрэчаны бурнай авацыяй, т. Калінін. Пленум прыняў пісьмовае прывітаньне т. Калініну ў зьвязку з 10-цігадовым знаходжаньнем яго на пасадзе старшыні ЦВК. Пасланы таксама прывітаньні ЦК УсеКП(б) ураду і г. д. На маскоўскі губэрскі зьезд саветаў абрана 690 дэлегатаў, у тым ліку т. т. Калінін, Сталін, Рыкаў, Молатаў, Варашылаў, Куйбышаў, Арджанікідзэ і інш.

Рабочыя брыгады ўскалыхнулі вёску.

МАСКВА, 2-4. 2-га красавіка пры ЦК УсеКП(б) адчыніўся пашыраны пленум цэнтральнае шэфскае камісіі. Старшынёю цэнтральнае шэфскае камісіі, замест вызваленага па асабістай просьбе т. Баумана, зацьверджан т. Лаціс. Заслухан даклад аб выніках дзейнасьці рабочых брыгад і новых формах шэфскае працы. У дакладзе адзначалася вялікая роля брыгад у часе перавыбарчай кампаніі. Толькі па 36 гарадох на вёску было накіравана каля 12 тысяч чалавек у выглядзе брыгад, ці адзінак-арганізатараў, агітатараў і г. д. Па ўсяму Саюзу колькасьць рабочых, накіраваных на вёску на перавыбары, дасягае некалькі дзесяткаў тысяч. Ад працы рабочых брыгад мы маем шэраг захапляючых водгукаў вясковых сходаў. Аўтарытэт шэфскіх арганізацый значна павысіўся.

У канцы дакладчык сьцьвярджае, што шырокія рабочыя масы цікавяцца пытаньнямі сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы, паміж іншым, пытаньнямі шэфскае працы. Гэтую ўвагу рабочых трэба накіраваць на сур'ёзныя палітычныя і гаспадарчыя задачы на вёсцы, на калектывізацыю і ўздым сельскае гаспадаркі, на палепшаньне савецкага апарату, на ліквідацыю няпісьменнасьці і г. д.

Вылучэньне рабочых адбываецца слаба.

ДНЕПРАПЯТРОЎСК, 2-4. Вылучэньне рабочых на мясцовых заводах праходзіць вельмі бяссыстэмна. Утворан вялізны рэзэрв вылучэнцаў (2280 чалавек), аднак, у працягу году з гэтае колькасьці вылучана толькі 380 чал.

БАРАЦЬБА ЗА ПРАЦОЎНУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ.

КАКАНД, 2-4. На шмат якіх прадпрыемствах Каканду, Самарканду і Тыфлісу працдысцыпліна няўхільна падае. Прафсаюзы і гаспадарцы не дастаткова энэргічна змагаюцца за ўзмацненьне працоўнае дысцыпліны.

Асабліва адрозьніваецца ў гэтым напрамку фэрганская шоўкава-матальная фабрыка. Так, напр. у 1927 г на гэтай фабрыцы было звыш 6 тысяч прагулаў, у 1928 г., на гэтай фабрыцы было звыш 6 тысяч прагулаў, у 1928 годзе—каля 8 тысяч, Баваўняна-ачышчальныя заводы таксама даюць няўхільны рост прагулаў. На нарадзе прафактыву ў Каканде было адзначана, што асноўнымі прычынамі паслабленьня працдысцыпліны зьяўляецца п'янства, агульная некультурнасьць рабочых мас і адсутнасьць асьветнае працы сярод адсталых рабочых.

Нарада намецілa шэраг канкрэтных мерапрыемстваў па ўзьніцьцю працоўнае дысцыпліны.

НАСКОК НА БЮРАКРАТАЎ.

СЬВЯРДЛОЎСК, 3-4. У Сьвярдлоўску, у Пермі і Цюмені РСІ праведзены наскокі на ўстановы. У Сьвярдлоўску вялікі лік рабочых пад выглядам сялянскіх хадакоў абышлі шэраг устаноў, каб атрымаць некаторыя справкі. Абсьледавацелі сустрэлі няўвагу, грубасьць і валакіту. На паказальным сухае, наладжаным РСІ, засяданьнем былі рабочыя ад варштату. На лаўцы падсудных сядзелі: загадчык кантрактацыйнага Каапхлебсаюзу, старшыня акруговага бюро калгасаў, член праўленьня вобласнога прамсялянсаюзу, інспэктар сельскагаспадарчага банку і чатыры радавыя працаўніка. Суд ухваліў прысуд: 3-х звольніць з адказнае працы, рэшта атрымалі вытгавары. У Цюмені ў наскоку ўдзельнічалі 75 рабочых, якія выявілі бюрократызм, грубыя адносіны да наведвальнікаў, бязладзьдзе. На лаўцы падсудных апынуліся: загадчык падатковым аддзелам Акрфа, старшыня транспартнае страхавое касы, загадчык амбуляторыяй, доктар і інш. Суд прысудзіў 3-х да пазбаўленьня правоў займаць у працягу году адказныя пасады, іншым ухвалены суровы вытгавар.

Дзікі выпадак хуліганства.

ХАРКАЎ, 2-4. 18 сакавіка ў капальні № 5 Пятроўскага рудакіраўніцтва здарыўся дзікі выпадак хуліганства. Рабочыя Пэтытаў, Багамолаў і Падабедаў, спусьціўшыся разам з старшым т. Слыгко ў капальню, зьнялі з яго вопратку і, абліўшы бензынам, падпалілі яго. Слыгко атрымаў моцныя апалы і на доўгі час страціў працаздольнасьць. Пэтытаў, Багамолаў і Падабедаў былі прысуджаны да зьняволеньня ў астрозе на адзін год кожны.

Адносна гэтага прадстаўнік праўленьня Донвугалю т. Лопаў заявіў карэспандэнту Ратау наступнае: «Я лічу зісім незразумелым такі мяккі прысуд. Пры сучаснай барацьбе за працоўную дысцыпліну паказальны суд, які відаць ня ўлічыў важнасьці задач на аднаўленьню нармальных умоў на прадпрыемстве і ўхваліў абвінавачаемым вельмі мяккі прысуд. Прысуд суду павінен быць перагледжан з тым, каб хуліганы падпалі больш суровага і заслужанаму пакаранню.

НАВУКОВАЯ ЭКСПЭДЫЦЫЯ Ў ПУСТЫНЮ КАРА-КУМ.

АШХАБАД, 3-4. Сёньня, у пустыню Кара-Кум накіроўваецца экспэдыцыя Акадэміі Навук СССР. Экспэдыцыяй кіруе акадэмік А. Э. Фэрсман. У склад экспэдыцыі ўваходзяць геалёг Д. І. Шчэрбакоў, Д. А. Федаровіч, гідралёг Н. Т. Холін і інш. Экспэдыцыя падзелена на тры атрады, якія накіроўваюцца ў розныя райёны. У гутарцы з прадстаўнікамі друку акадэмік Фэрсман заявіў: «Упяршыню ў Кара-Кумах я пабываў супольна з Шчэрбаковым—чатыры гады таму назад. У той час аб Кара-Кумах мелася вельмі туманнае ўяўленьне. Зараз, знаёмячыся ў Ашхабадзе са справаздачамі розных экспэдыцый, падарожжаў і камандыровак, мы ня можам не адзначыць вялікі посьпех у галіне вывучэньня Кара-Куму. Тое што здавалася далёкай праблемай робіцца дасягненьнем савецкае гаспадаркі і культуры. Мы спадзяёмся, што працы тых асобных партый, якія зараз накіроўваюцца ў Кара-Кум пойдуць на карысьць справы сацыялістычнага будаўніцтва.

БАРАЦЬБА ЗА УЛАДУ.

(Да падзей у Кітаі).

Ваенныя дзеяньні паміж войскам гуансійскае групоўкі і нанкінскага ўраду пачаліся. Гаміндананўскія генэралы спрабуюць зброю вырашыць пытаньне, ці павінен быць у Кітаі адзіны цэнтральны ўрад, ці моцныя райённыя ўрады, якія падначаляцца толькі намінальна якомусьці зданьнёваму цэнтральнаму ўраду, Чан-Кай-Шы, які стаіць на чале нацыянальнага ўраду, утварыўшы саюз з афармляючайся буйнай буржуазіяй прамыслова разьвітых прыморскіх правінцый (Цзянсу, Аньхуэй, Чжэцзян, Цзянсі і Фуцзян) зьяўляецца прыхільнікам цэнтралізму. Гуансійская групоўка, якая мае ў сваіх руках правінцыі Гуансі, Гуандунь, Хубэй і Хунань—прыхільнікі інтарэсаў паўфэадальнай буржуазеі сваіх эканамічна-адсталых правінцый змагаюцца супроць цэнтралізму, азначаючага гегемонію нараджаючагася ў Кітаі буйнага капіталу.

Непасрэдны повад да ваенных дзеяньняў—так званы „хунаньскі канфлікт" упяршыню з часоў „аб'яднаньня Кітаю" паставіў канкрэтна пытаньне аб барацьбе паміж абодвымі групоўкамі. Генэралы гуансійскае групоўкі, адхіліўшы назначанага напынальным урадам старшыню хунаньскага правінцыйнага ўраду Лю-Ці-Піна, адкрыта прад'явілі патрабаваньне, каб нацыянальны ўрад дзейнічаў у Хубэйскай і Хунанскай правінцыі толькі праз хуханьскую палітычную раду, якая знаходзіцца ў руках гуансійскае групоўкі. Гуансійцы заявілі пратэст супроць учынкаў генэрала Чэн-Кія-Лю, які не падпарадкуецца загадам хуханскае палітычнае рады. (Войска Чэн-Кія-Лю кантралююць шляхі зносін паміж Ханькоу і Кантонам. Гуансійцы непакояцца, што ён па загаду нанкінскага ўраду можа адрэзаць гуансійскае войска ў Хубэі і Хунані ад іх асноўнае базы—(ад Гуансійскае і Гуандуньскае правінцыі). Нарэшце гуансійская групоўка заяўляе, што Чан-Кай-Шы займаецца дробным палітыканцтвам, маноўруючы ў розных правінцыях паміж асобнымі групамі з мэтаю дыскрэдытаваць мясцовую ўладу, каб канчаткова падначаліць усе правінцыі цэнтральнаму ўраду.

Нацыянальны ўрад адказаў на ўсе гэтыя патрабаваньні і скаргі катэгарычнаю адмоваю, падкрэсьліваючы сваё контр-патрабаваньне аб поўным падпарадкаваньні правінцыйных урадаў. Нацыянальны ўрад патрабаваў, каб мясцовыя палітычныя рады ня ўмешваліся ў назначэньне ці звальненьне таго ці іншага старшыні правінцыйнага ўраду, а тым больш не карысталіся ўзброенай сілай, якая знаходзіцца ў іх распараджэньні, без адпаведнага дазволу органаў цэнтральнага ўраду.

Суадносіны сіл змагаючыхся бакоў вымяраюцца наступным момантам. Чан-Кай-шы, якога падтрымлівае буйная буржуазея 5 прыморскіх правінцый, уладаючы першаю армейскаю групаю, мае ў сваіх руках прыбытковы шанхайскі порт і сталіцу. Яго падтрымлівае цэнтральны апарат гаміндану і ўраду. Гуансійская групоўка знаходзіцца ў поўнай меры у менш спрыяючым становішчы. Войска генэрала Бай-Цзун-Чы ненадзейна. У Хубэйскай правінцыі, якая знаходзіцца намінальна пад уладаю гуансійцаў, вельмі моцны мясцовыя групоўкі. Гэткае-ж становішча і ў Хунаньскай правінцыі, буржуазея якой высоўвае лёзунг: «Хунаньская правінцыя—для хунаньцаў». Апроч таго, у паўночна-ўсходняй частцы Хунаньскае правінцыі, якая мяжуецца з правінцыяй Пяньсі, вельмі моцны ўплыў генэралаў, падтрымліваючых Чан-Кай-Шы. Да таго-ж у Хунаньскай правінцыі вельмі моцны рэвалюцыйны рух, на чале якога стаяць камуністы. Гуаньдуньская правінцыя ў значнай сваёй частцы таксама ахопленая сялянскімі паўстаньнямі, падначальваецца толькі часткова гуансійскай групоўцы. Аднак, асноўная база гуансійскае групоўкі—правінцыя Гуансі—мае надзвычайна важнае значэньне, зьяўляючыся падзейнаю крыніцаю грашовых сродкаў і верным прытулкам у выпадку паражэньня, у той час, як Чан-Кай-Шы ў гэтым выпадку можа разьлічваць толькі на гасьціннасьць міжнароднага сэтлмэнту Шанхаю ці Японіі.

Аднак, суадносіны сіл змагаючыхся бакоў нельга вымяраць толькі тымі матар'яльнымі рэсурсамі, якія знаходзяцца ў іх непасрэдным распараджэньні. Не падлягае сумненьню, што навакол ваенных дзеяньняў на хубэйска-хуханьскім фронце паслужыць сыгналам для адкрытай, а можа толькі скрытае барацьбы і ў астатнім Кітаі. Апроч гуансійскае групоўкі і Чан-Кай-Шы, у Кітаі маюцца ящчэ групоўкі, якія могуць быць уцягнуты ў той ці іншай ступені ў барацьбу. Гутарка ідзе аб Фын-Юй-Сяне, кантралюючым Хэнаньскую, Шансійскую правінцыі, Ганьсу і частку Шандуньскае правінцыі; аб Ен-Сі-Шане, кантралюючым Шансі, Хубэй і ўнутраную Манголію; аб Чжан-Сюэ-Ляне, кантралюючым Манчжурыю. Не падлягае сумненьню, што Фын-Юй-Сян, Ен-Сі-Шан і Чжан-Сюэ-Лян, адстайваючы ўласныя інтарэсы перад націскам буржуазеі прыморскае паласы, стаўленікам якой зьяўляецца Чан-Кай-Шы, наўрад ці выступяць супроць гуансійскае групоўкі ўжо і таму, каб не дапусьціць надмернага ўзмацненьня ўплыву Чан-Кай-Шы.

Але затое, у выпадку паражэньня таго ці іншага боку, імінуча пачнецца падзел здабычы, у якім прыймуць удзел усе нейтральныя пакуль сілы і барацьба, якая разгортваецца на хуханьска-хубэйскім фронце, бясспрэчна, абернецца ў новую грамадзянскую вайну ў большай частцы Кітаю. Розныя, часамі проста процілеглыя інтарэсы пануючых клясаў у розных райёнах зусім пазбавяць сэнсу падтрымліваемую Гаміндананам фікцыю аб адзіным буржуазным Кітаі. Зараз п

Безадкладна выправіць хібы ў падрыхтоўцы да сяўбы.

Прыклад усёй Аршаншчыне.

Заданьне па зернаачышчэньню выканана на 140 процантаў.

(Суслаўскі с-с., Дрыбінскага р-ну, Аршаншчына).

Падрыхтоўка да вясеньняй пасеўкампаніі ў гэтым годзе значна адрозьніваецца ад мінулагодняй. Плян складзен яшчэ ў сьнежні месяцы. У час перавыбарчай кампаніі на сялянскіх сходах ставіліся пытаньні ўзьняцьця ўраджайнасьці. Праэкт пастановы СНК аб агрыкультурных мерапрыёмствах і адозва ЦВК аб пашырэньні яравога кліну растлумачаны па ўсіх вёсках.

Сельсавет некалькі разоў рабіў адчыненыя пасяджэньні прэзыдыумаў і пленумаў у паасобных вёсках, дзе абгаварваліся разам з сялянствам пытаньні ўзьняцьця ўраджайнасьці і карысьць агрыкультурных мерапрыёмстваў,—як зернаачышчэньне, збор попелу, раньні попар, палепшаньне сенажацяй.

Аб зацікаўленасьці сялян узьняцьцем ураджайнасьці сьведчыць наступны факт. Сяляне вёскі Будзіна па сваёй уласнай ініцыятыве арганізавалі ячэйку Асоавіахім, якая пастанавіла закласьці вопытна-паказальны участак на школьнай дзялянцы.

У распараджэньні с-с. маюцца толькі 2 зернаачышчальныя машыны. Гэты, з дазваленьня сказаць, „абоз" пушчан па вёсках больш месяца таму назад і на 24 сакавіка ачысьціў 35,5 тон насеньня, альбо выканаў заданьне на 40,78 проц. Апроч гэтага сяляне ачысьцілі на ўласных машынах (арфы) 65 тон. Такім чынам ачышчана ўсяго па сельсавеце 98,5 тоны, альбо выканана 140 проц. пянавых меркаваньняў.

Па неземлеўпарадкаваных вёсках праведзены сходы па растлумачэньню карысьці зямлеўпарадкаваньня, пераходу на шматпольле і на калектыўную форму жыцьця. Ёсьць шэраг пастаноў цэлых пасёлкаў і нават вёсак аб пераходзе на шматпалёвы севазварот. Таксама арганізавана адна калектыўная гаспадарка.

Зараз камітэт узаемадапамогі ўзмацніў працу па загатоўцы насеньня. За свае ўласныя сродкі загатоўлена аўсу 300 пудоў і ячменю 40 пудоў, так што беднята будзе часткова забясьпечана насеньнем апроч крэдытнага таварыства.

Кепска абстаіць справа з забясьпечаньнем сялян насеньнем канюшыны і лубіну: неабходна для 707 гаспадарак 1110 кілёграм, а крэдытнае таварыства вызначыла толькі 210 кілёграм.

Усе гэтыя мерапрыёмствы кажуць за тое, што вясну мы спаткаем з ачышчаным насеньнем, раньнім папарам, забаронай пасьбы жывёлы на сенажацях і шэрагам другіх практычных мерапрыёмстваў па ўзьняцьці ўраджайнасьці, што бязумоўна дасьць станоўчыя вынікі.

А. К.

Дырэктывы для камісій,—камісіі для дырэктыў...

З мэтай практычнага ўдзелу ў пасеўкампаніі, Полацкая акруговая паштовая кантора пачынае тэлефонізацыю падшэфнага Баярскага с.-с. Парт'ячэйка сабрала сярод партыйцаў па падпісному лісту 30 руб., 15 руб. дала адміністрацыя. На гэтыя грошы набыта для беднаты падшэфнага с.-с. некалькі плугоў.

Арганізован збор попелу ўсімі сябрамі саюзу па кватэрах а таксама ў канторах.

Кепска, што акр. аддзяленьне саюзу амаль нічога ня робіць, існуючая пры ім шэфкамісія безьдзейнічае.

Два тыдні таму назад акрадзяленьне выпадкова, без папярэдняй падрыхтоўкі абгаварвала на сваім пасяджэньні пытаньне аб удзелу ў пасеўкампаніі, дзе было вырашана даць указаньні на месца і... склаьці камісію для распрацоўкі канкрэтных мерапрыёмстваў, але да гэтага часу ніякіх мерапрыёмстваў няма, камісія ўсімі пакінута, дырэктывы на месцы таксама не даны, бо ў акрадзяленьня «часу яшчэ ня было».

— Чаму вы не займаліся гэтым раней?—пытаюцца сябры ў саюзе.

— Дырэктыў ад АСПС чакалі,—адказвае старшыня.

Гэткія «мерапрыёмствы» назіраюцца па шэрагу саюзаў.

М. Сев—й.

Савгасам трэба падцягнуцца.

Зьвесткі з Бабруйшчыны сьведчаць аб значных посьпехах падрыхтоўкі да сяўбы ў савгасах. Апошнімі ўжо здадзена каапэрацыі 9708 п. гатунковага насеньня, абмепена палепшанага 2900 п., забраніравана для кантрактацыі бульбы 19600 п., ачышчана сялянскага насеньня 81000 п.

Савгас Халопенічы ачысьціў 6862 п., Веснава 5000 п., Боркі 4200 п., Палажэвічы 3200 п., савгасы Сьвіслач, Чырвоны Бераг і Побалава выканалі заданьні РВК па ачыстцы сялянскага насеньня амаль на 100 проц. Арганізавана 6 новых майстэрняў. Упярыню на праведзеных 11 курсах для рабочых былі прыцягнуты 74 селяніны, праведзена 25 аб'яднаных сходаў рабочых з сялянамі і калгаснікамі па пытаньнях уздыму ўраджайнасьці.

Лепш падрыхтаваліся і самы савгасы. У большасьці адрамантаваны інвэнтар, прапушчана насеньне праз трыер, атрымана ўжо 25000 пуд. штучных угнаеньняў, сабрана попелу 10508 пудоў. Асаблівыя посьпехі выявіў савгас Ціхінічы, сабраўшы больш 1500 пудоў попелу.

Аднак маюцца і недахваты. Ува ўсёй агравытворчай працы яшчэ шмат голай прапаганды, а не практычнай працы па арганізацыі вёскі. Лёзунг—арганізаваць на менш аднаго калгасу ці каапэрацыйнага аб'яднаньня на савгас—яшчэ не ажыцьцёўлены. Савгасы пакуль што слаба дапамагаюць растлумачэньням сялянству ільгот па сельскагаспадарчаму падатку. На 24-Ш вельмі мала адрамантавана сялянскага інвэнтару.

У падрыхтоўцы да сяўбы слабей за ўсё падрыхтаваны меры ўздыму гаспадаркі па больш высокую тэхнічную ступень. Недапушчальна слаба скарыстоўваюцца сталыя вынікі працы дасьледчых станцый. Той факт, што ў большасьці не падрыхтаваны складаны інвэнтар—радковыя сяўнікі і інш., сьведчаць аб руціне, раўненьні па тэхніцы з сялянскімі гаспадаркамі. Лепшая арганізацыя працы, максымальнае вытворчае ўплатненьне працоўнага дню, рашэчы перавод на зьдзельшчыну і правядзеньне прэміраваньня, уздым працоўнае дысцыпліны і павышэньне вытворчай кваліфікацыі павінны дапамагчы вырашэньню гэтых задач.

Зьніжэньне сабекошту прадукцыі праз уздым вытворчасьці ўсіх галін гаспадаркі, рост вытворчасьці і якасьці працы, зьніжэньне розных накладных выдаткаў—павінна знайсьці сабе максымум увагі ў падрыхтоўцы. Гэтыя пытаньні яшчэ не знайшлі сабе дэталёвага вырашэньня. Вытворчыя нарады слаба яшчэ працуюць.

Рабочыя калектывы часта ня ведаюць, што асобныя віды прадуктаў асобных савгасаў бываюць у некалькі разоў вышэй рынкавай каштоўнасьці іх. Сьпячка, вяласьць, а дзе-ні дзе п'янка, абы-якія адносіны, павінны быць заменены калектыўнаю творчаю працаю.

Савгасы павінны быць забясьпечаны насеньнем канюшыны, вікі, лубіну, якога не хапае. Астатак часу трэба максымальна выкарыстаць на выпраўленьне хібаў.

Т. Аўчыньнікаў.

Чырвоная армія дапамагае ўзьняць ураджайнасьць.

АБВШ У ПАХОДЗЕ ЗА ЎРАДЖАЙ.

З самага пачатку вясеньняй пасяўной кампаніі ў Аб'яднанай Беларускай Вайсковай Школе на гэты важны палітычны момант была зьвернута належная ўвага і праведзена энэргічная праца пад лёзунгам: «На барацьбу за ўраджай!»

Перш за ўсё за гэтую справу ўзяліся партыйная і камсамольская арганізацыі школы. Быў праведзен інструктаж сакратароў партыйных і камсамольскіх ячэек па пытаньнях узьняцьця ўраджайнасьці, а потым гэтае пытаньне прапрацоўвалася па лініі партыйнай і пазашкольнай працы. Акрамя гэтага пытаньне па ўзьняцьцю ўраджайнасьці і ў асаблівасьці новы закон аб с.-г. падатку сваечасова прапрацоўваліся ў часы вучэбных заняткаў па ўсіх клясах, у сувязі з вывучэньнем пастаноў XII зьезду КП(б)Б.

На лініі пазашкольнай працы праведзены цэлы шэраг кансультацый адказных мясцовых працаўнікоў Наркамзему і сяброў саюзу рабземлесу па пытаньнях узьняцьця ўраджайнасьці сельскае гаспадаркі, канкрэтна прыстасоўваючы мерапрыёмствы да мясцовых умоў.

Арганізавана выстаўка літаратуры пад агульным загалоўкам: „За ўраджай!", дзе курсанты заўсёды маюць магчымасьць паглябляць свае веды па таму ці іншаму пытаньню адносна ўзьняцьця ўраджайнасьці сельскае гаспадаркі.

У падшэфны Гаенскі сельсавет былі арганізаваны выезды, куды накіроўваліся найбольш моцныя і працаздольныя таварышы; яны праводзілі там цэлы шэраг гутарак і дакладаў.

Працу па ўзьняцьцю ўраджайнасьці ўвязвалі з галоўнымі бягучымі кампаніямі партыі ў вёсцы: перавыбары саветаў, пасяўная кампанія, хлебазагатоўкі, с.-г. падатак і г. д.

Дзякуючы такой жывой сувязі з падшэфным сельсаветам мы маем там значныя дасягненьні. Беднята амаль што поўнасьцю правяла ачыстку насеньня. Ёй-жа былі прадстаўлены значныя льготы па ўступленьню ў каапэрацыю; зараз мы маем 50 проц. каапэрацыйных бядняцкіх гаспадарак па сельсавету.

У час вайсковай вучобы, на зімовых выхадах АБВШ у поле, па лініі палітпрацы праводзілася праца па ўзьняцьцю ўраджайнасьці сярод мясцовага насельніцтва. Курсанты і начскład у вольны ад „баявых абставін" час растлумачвалі насельніцтву бягучую палітыку партыі ў адносінах да сельскае гаспадаркі і закранулі заўсёды пытаньне па ўзьняцьцю ўраджайнасьці.

У агульнашкольным маштабе абвешчан конкурс на лепты ліст у вёску. Амаль-што ўсе курсанты пішуць лісты ў вёску і растлумачваюць сваім бацькам аб новым с.-г. падатку і наогул аб шляхох узьняцьця ўраджайнасьці.

У далейшым па лініі пазашкольнай працы намечана заслухаць даклад Наркамзему аб тым, як праходзіць кампанія на мясцох. Будуць арганізаваны экскурсіі ў «Дом Селяніна» і ў камуну «Чырвоная Зорка» для азнаямленьня з практычным правядзеньнем мерапрыёмстваў па ўзьняцьцю ўраджайнасьці.

А. Лопаёў.

Безадказнасьць.

(Чэрвеншчына).

З зернаачышчэньнем па Чэрвенскаму р-ну, Менскай акр., справа абстаіць вельмі дрэнна. Заданьне выканана толькі на 54 проц.

На райёне працуе 26 зернаачышчальных машын. 10 перасовачных абозаў выехалі на вёскі. Былі выпадкі, што кулакі захоплівалі ў свае рукі абоз і трымалі яго колькі хацелі. Такі выпадак быў у Руднянскім сельсавеце. Беднякі заяўлялі ў сельсавет, у камітэт узаемадапамогі, але апошнія ня прымалі ніякіх мер. Шмат ёсьць нядбайных, злачынных адносін да кампаніі зернаачышчэньня. У тымжа Руднянскім сельсавеце пры КСУ ўвесь час бяздзейнічае трыер. Няма сіт. Пры Горкаўскім КСУ таксама стаіць паламаная картыроўка.

Кантрактацыя—справа добрая, карысная, але на Чэрвеншчыне яна яшчэ ў падпольі. Кантрактаваць няма чаго і няма чым. Завознага пасеўнага матар'ялу не хапае забясьпечыць калгаскія і бядняцкія гаспадаркі. З завозам штучнага ўгнаеньня таксама дрэнна. Завезена 4 вагоны штучнага ўгнаеньня, якое будзе давацца толькі кантрактоўшчыкам. А трэба закантрактаваць плошчу ў 900 гэктараў. Улічваючы патрэбы насельніцтва ў штучным угнаеньні, гэта колькасьць зусім мізэрная. Меркавалася 30 проц. пасеўплошчы сёлета засеяць лубінам, але насеньня і на сёньня няма. Аб сэрадэлі чэрвенцы яшчэ нават ня ведаюць.

Праца райённага камітэту сялянскае ўзаемадапамогі заняпала. Сельскія камітэты ўзаемадапамогі што хочуць, тое і робяць. На спагнаньне адтэрмінаваных павык—грашовых і насенных—зварачвалася недастатковая ўвага.

Былі выпадкі, калі старшыня сельскага камітэту ўзаемадапамогі браў сабе пазыку ў першую чаргу і колькі хацеў. Старшыня хутарскага камітэту ўзяў сабе ў першую чаргу 15 пудоў насеньня, потым высьветлілася, што беднякам, якія мелі большую патрэбу, не хапіла.

Дрэнная праца тлумачыцца адсутнасьцю цьвёрдага, правільнага кіраўніцтва з боку райённага камітэту сялянскае ўзаемадапамогі. Старшыня Райкму зусім не адпавядае свайму прызначэньню.

Ст. Іва.

АД РЭЗАЛЮЦЫЙ--ДА СПРАВЫ!

НА ДОБРУСКАЙ ФАБРЫЦЫ ПРАЦОЎНАЯ ДЫСЦЫПЛІНА КУЛЬГАЕ.—РАБОЧЫЯ Ў ЧАСЕ ПРАЦЫ СТАЯЦЬ У ЧАРЗЕ КАЛЯ ЛАРКА.—ЦП САЮЗУ І ТРЭСТ ЦЯГНУЛІ 2 МЕСЯЦЫ ВАЛАКІТУ З РАСПРАЦОЎКАЙ ПРЫНЦЫПАЎ ПЕРАГЛЯДУ НОРМ І РАСЦЭНАК.—ВЫНОСІЛІСЯ ШМАТ ДОБРЫХ ПАСТАНОЎ, АЛЕ ЯНЫ НЕ ПРАВОДЗІЛІСЯ Ў ЖЫЦЬЦЁ.—САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ДАПАМОЖА ЗЬНІШЧЫЦЬ УСЕ НЕДАХОПЫ.

Прадстаўнік ЦК КП(б)Б тав. Эпштэйн, які выяжджаў на Добрускую папяровую фабрыку для абсьледаваньня і растлумачэньня пастаноў дырэктыўных органаў па пытаньню падняцьця працоўнай дысцыпліны, у гутарцы з нашым супрацоўнікам прывёў з жыцьця фабрыкі шэраг прыкладаў, якія адбіваліся як на падняцьці вытворчасьці, так і на паляпшэньні працоўнай дысцыпліны.

Ларок на тэрыторыі фабрыкі.

Цікава адзначыць, што да нашага прыезду на самой фабрыцы існаваў так званы ларок. Нам давялося быць сьведкамі, як вялікая чарга рабочых стаяла каля ларка па паўгадзіны ў часе працы. Бязумоўна, гэты ларок пасьля нашага прыезду зачынілі, і рабочыя самі адзінадушна падтрымалі гэта мерапрыёмства.

На такой буйнай фабрыцы, як Добруская, прахадная будка была пастаўлена вельмі кепска: ня было кантролю за ўхай рабочых на работу, шмат рабочых свае нумары ня вешалі на кантрольную дошку і не забіралі іх адыходзячы з работы. Нам прышлося назіраць, як рабочыя пазьніліся на паўгадзіны і зусім вольна праходзілі ў свае цэхі і станавіліся на работу.

У мэханічным цэху, у паккамэры і іншых цэхах фабрыкі шмат рабочых выходзіла з фабрыкі за 15-20 хвілін да канца работы, і ніхто на гэта не зьвяртаў увагі.

Доўгія спрэчкі саюзу і трэсту.

Нормы выпрацоўкі і зьдзельныя расцэнкі да моманту прыезду ня былі перагледжаны. Цікава адзначыць, што пры заключэньні калдагавору ў студзені паміж саюзам і трэстам ішлі спрэчкі аб некалькіх днёх.

Урэшце, спрэчкі былі вырашаны арбітрам і апошнім тэрмінам быў устаноўлен 15 студзеня. Між тым да нашага прыезду, г. зн. да апошніх дзён сакавіка, гэтых дырэктыў ні трэст ні ЦП саюзу не далі.

Замест таго, каб да 1 красавіка скончыць практычную працу па перагляду норм і расцэнак, толькі ў часе нашага прыезду пры дапамозе прадстаўніка ЦСПСБ дырэктар трэсту і прадстаўнік ЦП саюзу дагаварыліся аб гэтых прынцыпах, і зараз ужо ёсьць магчымасьць прыступіць да практычнай працы па перагляду.

Заблытаная сыстэма аплаты працы.

Між тым сыстэма аплаты працы на Добрускай фабрыцы патрабуе карэннай рэарганізацыі, бо існуючая сыстэма адбіваецца на вытворчасьці працы. Так, у той час, калі па ўсіх прадпрыёмствах СССР даўно перайшлі на індывідуальную зьдзельшчыну, на папяровых фабрыках і ў тым ліку на Добрускай існуе заблытаная прэміяльная сыстэма аплаты працы. З гутарак з рабочымі, а таксама і на рабочых сходах высьветлілася, што ніхто з рабочых не разьбіраецца ў гэтай складаній сыстэме. Нават некаторыя інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі адкрыта заяўлялі, што і яны ня могуць разабрацца ў прэміяльнай сыстэме. Толькі з гэтай прычыны ў некаторых цэхах маглі зьявіцца такія «несуразныя» заявы асобных рабочых, што чым менш выпрацоўваеш, тым больш зарабляеш, і ў сувязі з такімі поглядамі сьвядома не павялічвалі выпрацоўкі.

Уся гэта "неразьбярыха яшчэ раз падкрэсьлівае, што пры перагляде норм і расцэнак павінна быць устаноўлена простая і ясная для кожнага рабочага сыстэма аплаты працы.

Рэзалюцый шмат, а толку...

Нельга не адзначыць таго, што гутаркі аб падняцьці працоўнай дысцыпліны на Добрускай фабрыцы распачаліся яшчэ задоўга да нашага прыезду. Ёсьць многа добрых і правільных рэзалюцый і пастаноў, вынесеных партканкрэсьтывам і іншымі арганізацыямі фабрыкі. Напрыклад, вельмі важнае пытаньне аб выпрацоўцы палажэньня аб правох і абавязках майстраў і загадчыкаў цэхамі было вырашана яшчэ 11 лютага, нават тады-ж быў устаноўлен і 2-хтыднёвы тэрмін для выкананьня пастановы, але ў працягу паўтара месяца да распрацоўкі гэтага палажэньня ня было прыступлена. Таксама даўно вынесена цэлы шэраг пастаноў аб палепшаньні праходжай будкі, аб перагляде правіл унутранага распарадку і г. д., але па гэтых пастановах канкрэтнага нічога не рабілі, і справа наперад ня рухалася.

Нельга абысьці моўчкі і таго факту, **што камсамольская арганізацыя фабрыкі праспала камсамольскі прамысловы паход** і толькі к нашаму прыезду гэта пытаньне было пастаўлена на абгаварэньне.

Як ужо вядома, у сучасны момант грамадзкія арганізацыі фабрыкі і самі рабочыя зрабілі добры пачын, уступіўшы ў сацыялістычнае спаборніцтва выклікаўшы і іншыя прадпрыёмствы Гэта можна толькі вітаць.

Але калі ня будзе штодзённай праверкі выкананьня ўсіх пастаўленых спаборніцтвам задач, дык ёсьць не бясьпека, што добрыя пажаданьні застануцца толькі ў рэзалюцыях.

Перад Добрускай фабрыкай зараз стаіць канкрэтная задача: **ад рэзалюцый—да справы!**

За клясава-вытраманы і блізкі да мас апарат

АБ'ЕЗДЧЫК—СПЭКУЛЯНТ.

(Бабруйская акруга).

Аб'ездчыка Крываносаўскага лясьніцтва Ракаўца ўсе ведаюць, як спэкулянта лесам. Ведаюць, што ён груба адносіцца да сялян. Таксама ведаюць-што Ракавец першы чалавек, які памагаў папу ў дурмане насельніцтва.

Калі зайдзеце да яго ў хату, то на першым пляне вы ўбачыце лёзунг: „Не плеваць, не курыць і мужыкам не заходзіць» І сапраўды, калі мужык зойдзе, ён крычыць: „Ах ты, мужыцкая хара"! Ты з лапцямі пойдзеш да мяне ў хату!?»

Працуючы ў лясьніцтве, ён карыстаецца лесам, колькі яму хочацца: пабудаваў 3 хаты, з якіх адну прадаў кулаку хут. Прусы.

Крываносаўскага папа прысудзілі за няўплату падатку. Сялянам хоць-бы што, кажуць яны.--клопат вялікі, а «бедны» Ракавец аж плача. Як-жа ня плакаць,—цяпер ужо ня будзе з кім выпіць чарку гарэлкі.

Абрамовіч.

Упаўнаважаны Белмясгандлю—спэкулянт.

Жыве ў Койданаве вядомы мясьнік Любошыц, мае ўласную краму і зарабляе грошы. Але трохі несьпавата яму было, як прыватніку, і вось ён аказаўся на пасадзе ў Белмясгандлі ў якасьці ўпаўнаважанага па закупы жывёлы.

Зараз праца ідзе ў яго на «шырокую ногу». Любошыц здабыў пасьведчаньне і для сваіх сыноў, што яны таксама агенты Белмясгандлю, і разам з ім падрывае працу каапэрацыі і пашырае сваю ўласную «каапэрацыю».

Белмясгандаль, ці не абыдзецца без гэтага каапэратара?

Пісьменны.

„Грыбачэўшчына".

Начальнікам Дрысенскай пошты Полацкай акругі, у свой час быў Грыбач—сябра партыі. Разам з ім, у яго непасрэдным падпраддаваньні працавала і яго жонка. Для Грыбача ня існаваў закон улады ад 1923 году аб недапушчэньні сумеснай службы радні.

«Праца» жонкі зводзілася да гандлю кантрабандной латвійскай гарэлкай, якую ёй дастаўляў асьвейскі паштавік С. у паштовых сумках і чамаданах цэлымі скрынкамі. Тэлеграфная лінія доўгімі гадзінамі займалася для «службовых» перамоў «мадам начальніцы» з Асьвеяй аб...чарговай цёмнай апэрацыі.

Грыбач усё гэта ведаў. Добра ведалі аб гэтым і дрысенскія паштавікі, але...

— Трэба ў той час слова сказаць, як заўтра апынішся ў шэрагах беспрацоўных,—гаворыць зараз адзін з іх.

На пошце панаваў самы сапраўдны зажым, пышна працьвітала падхалімства.

Прайшоў некаторы час. Грыбача прызначылі начальнікам акруговай п.-т. канторы.

Ня гледзячы на пратэсты саюзу і на тое, што сярод паштовых работнікаў было шмат беспрацоўных, Грыбач перавёў і ўстроіў у кантору сваю... жонку. Услед за жонкай паехалі з Дрысы ў Полацак (вядома з пад'ёмнымі) падхалімы і кумаўё. Усім і ўсімі кіравала і распараджалася „мадам-начальніца". Усе зьвярталіся папярэдня да жонкі, а ўжо пасьля ішлі да Грыбача.

— Хочаш працу атрымаць, ці вышэйшы разрад, дык трэба было мець міласьць „начальніцы".

Пры яе дапамозе быў прынят на працу нейкі Асаловіч, растраціўшы ў 1928 г. 400 руб. Трымаліся таксама тут крымінальныя элемэнты, як Скаварада, Вільневіч, Дыман і г. д. Апошні, ня гледзячы на зробленую ім растрату на 800 руб., быў пераведзен на пасаду памоцніка Грыбача па тэхчасьтві. Вільневіч, растраціўшы ў Бігосаве 100 руб. быў перакінут (абавязкова з пад'ёмнымі) у Дрысу, дзе ізноў зрабіў растрату на 109 р.

Былыя лодыры, разгільдзяі, кантрабандыстыя, якія нават былі пад судом, усе яны знайшлі сабе месца ў канторы. Грыбач іх «не заўважаў».

Ён-жа ўстроіў у Асьвеі сваю сястру. Грыбач згрупаваў вакол сябе ядро падхалімаў, наладжваў „бал-маскарады", «сямейныя вечары».

Панаваў зажым. Гора было таму, хто дазваляў неасьцярожна крытыкаваць начальства. Вельмі метка адбівае гэтае зьявішча заметка в насьценгазэты пра Грыбача, якая даводзіць, што адзін працаўнік напісаў пра адміністрацыю заметку і праз некаторы час быў зволены з працы. Аднойчы Грыбач звольніў з працы працаўніцу за тое, што яна «чужда псіхалёгіі рабочае клясы», а праз год яе вастанавілі з выплатай 325 руб. за прагул.

У 1927 г. Грыбач рамантаваў кантору, ухлопаўшы на ўнутраны рамонт 5008 р. Ахварбованыя сьцены маўчаць аб тым, што бачылі і настойліва патрабавалі праз год новага рамонту, а Грыбач спакойва працуе ў Менску. Адначасова ў гэтым Грыбач убіраў сваю кватэру, ствараў камфорт для жонкі; браў лепшую мэблю нават з установы, бо загадчыкамі аддзелаў былі свае людзі, гутарка з якімі заўсёды капчалася словам—„разьлічыміся". І яны разьлічваліся.

Падышоў рамонт. У склад будаўнічай камісіі ўвайшлі: Грыбач, Дыман, Скаварада і інш. Знайшоўся «добры» прыказчык адной крамы, які згадзіўся падрабляць рахункі. Скаварада браў рахункі, Грыбач іх падпісваў. Вось, напрыклад, адзін такі рахунак усяго толькі на... 401 р. А іх не адзін—іх некалькі.

Акрамя рамонту былі і іншыя, але больш «дробныя» справы. Загатаўляў Грыбач і к-о вытворчую мэблю. Стол тэлеграфны па рахунках каштуе 250 руб., а зараз сьведомыя людзі кажуць, што чырвоная цана яму 50 р. А колькі ёсьць гэткіх сталоў, скрынак і шафаў? Іх шмат.

Раней аб усім гэтым маўчалі і зразумела чаму. Трэба было толькі Грыбачу зрабіць сур'ёзны выгляд, як усе па кутках, усе заняты працай, няма нікому справы да таго, што там робіць Грыбач і к-о.

— Мне Грыбач больш 2 гадоў павінен 75 кап., якія я яму пазычыў на пакрыцьцё растраты, зробленай яго братам, але і прасіць баяўся, пісаў некалькі разоў у Менск, але, нават ён і не адказвае,—гаворыць радавы працаўнік т. Рубанікаў.

Надышла самакрытыка, вывярнула навыварат «Грыбачаўшчыну», ад якой да гэтага часу ня вылячылася полацкая сувязь. За гэтыя дзеньні, выкрытыя РСІ, «Грыбачэўшчына» павінна хутка прадстаць перад пралетарскім судом.

Пакуль суд ды справа, а наш «гэрой» працуе у... НК РСІ на пасадзе інспэктара. Парт'ячэйка Полацкай пошты ставіць пытаньне аб прабываньні Грыбача ў шэрагах партыі, а мы дадаем, што яго мейсца гэткім «грыбкам» і ў савецкім апараце, а тым больш у РСІ.

Кропка.

„Трука-артыст" Карзуноў

(Рагачэўскі райён, Бабруйскае акругі.)

У вёсцы Азяранах, дзе знаходзіцца канцылярыя Ціхініцкага Лясьніцтва, быў кірмаш. У той час, у канцылярыі Лясьніцтва было шмат сялянства.

Зьявіўся туды і палясоўшчык Гарбузоў па нейкіх справах, а праз некалькі хвілін прышоў туды ў п'яным выглядзе аб'ездчык Карзуноў Амос. Убачыўшы лясьніка Гарбузова, Карзуноў пачаў яго крыць «матам», абзываць бандытам і пляваць у твар. Потым па чаразе выляў матам лясьнічага, рахункавода і так разыйшоўся, што каб суняць яго прышлося гукнуць старшыню с-савету т. Барохава. І калі апошні пачаў яго суцішаць, дык ён яшчэ больш пачаў лаяцца, абзываў усіх бандытамі, а потым выламаў дзьверы ў памяшканьні лясьнічага і, схапіўшы са стала справавода справы і кнігі, пачаў раскідваць іх па канцылярыі і стукаць па сталу.

Урэшце кінуўся к справаводу з наганам, ад чаго з перапуду ўсе працаўнікі пакідалі працу і паразьбеглісь.

Здавалася-б, што досыць гэтага? Але не. 27 лютага днём, у лес, сумесна з лясьнікамі Кавалёвым, Раманьковым і Баранавым Карзуноў у п'яным выглядзе зьбіў селяніна Кліма Маслава, якога пры гэтым Карзуноў параніў з нагана ў плячо.

Я. Ш.

АД РЭДАКЦЫІ: ДОПІС АНАЛЁГІЧНАГА ЗЬМЕСТУ АТРЫМАН АД СЕЛЬКОРА «МЯТЛЫ». МЫ ДУМАЕМ, ШТО ЛЯСЬНІЦТВА ЗВОЛЬНІЦЬ З ПАСАДЫ АБ'ЕЗДЧЫКА КАРЗУНОВА, А СУДОВЫЯ ОРГАНЫ ПРЫЦЯГНУЦЬ ЯГО ДА АДКАЗНАСЬЦІ.

У Магілеўшчыне слаба падрыхтаваліся да сяўбы.

Падрыхтоўка да вясеньняй пасеўнай кампаніі па Магілеўскай акрузе распачалася яшчэ ў лістападзе 1928 г. Акруговы плян правядзеньня вясеньняй пасеўнай кампаніі быў сваечасова складзены і ў пачатку сьнежня разасланы па райёнах. Адначасова, для лепшага ажыцьцяўленьня вызначаных плянам мерапрыёмстваў, у канцы сьнежня была праведзена спэцыяльная нарада з удзелам усіх загадчыкаў райвэмчастак, райагрономаў, прадстаўнікоў ад с.-г. каапэрацыі і загадчыкаў савгасаў, на якой былі падрабязна распрацаваны пытаньні правядзеньня вясеньняй сяўбы. Апроч таго, у пачатку студзеня г. г. была праведзена нарада па калгаснаму будаўніцтву.

Аднак, як паказаў пленум АК КП(б)Б, на якім 17 сакавіка сталла пытаньне аб падрыхтоўцы да вясеньней пасеўнай кампаніі 1929 г., ня гледзячы на ўсе гэтыя мерапрыёмствы, у ходзе кампаніі адзначаецца шэраг буйных недахопаў.

Большасьць райённых плянаў вясеньняй пасеўнай кампаніі складзены са значным спазьненьнем, неканкрэтна і недастаткова ўвязаны з камітэтамі сялянскай узаемадапамогі і с.-г. каапэрацыяй. Па шэрагу райёнаў бяз усякіх абгрунтаваньняў прадугледжанае па акруговаму пляну павялічэньне агульнай пасеўнай плошчы на 2 з палов. проц. скарочана. Так, напрыклад: плянам Крычаўскага РВК вызначана павялічэньне пасеўнай плошчы на райёну толькі на 1 проц., а па пляну Лупалаўскага РВК—на паўтара проц. Асабліва неабходна адзначыць недастатковае пашырэньне плошчы лёну. Пры павялічэньні па акруговаму пляну пасеўнай плошчы над лён на 12 проц. па Прапойскаму райёну намячаецца рост на 4,1 проц., а па Чэрыкаўскаму на 5 проц.

Што датычыцца с-саветаў, дык да сакавіка месяца некаторыя с-саветы нават зусім ня склалі плянаў правядзеньня вясеньняй пасеўнай кампаніі, а складзеныя—у значнай ступені неканкрэтны; так, напрыклад, мерапрыёмствы па падвышэньню ўраджайнасьці паказаны агульна, не прадугледжана праца па калектывізацыі вёскі і г. д.

Вельмі слаба разгорнута папулярызацыя задач пасеўнай кампаніі сярод сялянства. Праведзеныя па сельсаветах сходы насілі характар агульных разважаньняў, без абгаварэньня практычных мерапрыёмстваў, якія неабходна ажыцьцявіць на тэрыторыі сельсавету ў часе вясеньняй сяўбы. Насельніцтва недастаткова асьвядомлена аб карысьці збору попелу, ужываньні торфу, вапны і інш. Новы закон аб с.-г. падатку недастаткова папулярызаваны сярод працоўнага сялянства, што скарыстоўваецца заможнай часткай для злоснай агітацыі супроць мерапрыёмстваў партыі і савецкай улады па правядзеньню вясеньняй пасеўнай кампаніі. Канкрэтна агітацыя кулакоў выяўляецца ў застрашваньні павялічэньнем сельска-гаспадарчага падатку, у агітацыі супроць ачысткі насеньня, супроць арганізацыі калгасаў і г. д.

Сялянскі актыў, камсамол і настаўніцтва да апошняга часу недастаткова былі ўцягнуты ў працу па правядзеньню вясеньняй пасеўнай кампаніі. Ня ўсюды былі праведзены сходы беднаты. Ня гледзячы на некаторы зрух, практычная праца камсамолу па арганізацыі паходу за ўраджай разгорнута недастаткова. Плян правядзеньня курсаў па падрыхтоўцы вясковага актыву і па калектывізацыі парушаны. Значнай перашкодай у гэтым напрамку зьяўляецца несваечасовы перавод грошай з боку НКЗ. Хаты-чытальні слаба разгарнулі растлумачальную працу і не забясьпечаны належнай літаратурай.

На пытаньне калектывізацыі вёскі акруговымі ўстановамі была зьвернута вялікая ўвага. Па акруговаму пляну намечана (адначасова з узбуйненьнем і ўмацненьнем старых калгасаў) арганізаваць 222 новыя калгасы з плошчай у сярэднім кожны 120-140 гэктараў з такім разрахункам, каб на 30 проц. земляўпарадкаванай сёлета плошчы арганізаваць калгасы. Апроч таго, намечана ў кожным райёне арганізаваць ня менш аднаго буйнага калгасу на плошчы 300-400 гэктараў. Да паловы сакавіка гэты плян па колькасьці новаарганізаваных калгасаў выкананы толькі на 27,7 проц., прычым усе яны дробныя і разьмеры іх зямельнай плошчы не адпавядаюць плянавым меркаваньням. Асабліва ў гэтым напрамку адзначаюцца Шклоўскі, Лупалаўскі і Крычаўскі райёны, дзе арганізацыя новых калгасаў праводзіцца на плошчы 35-40 гэктараў бяз вучоту пэрспэктыў на іх узбуйненьне на бліжэйшы час. Праца на ўзбуйненьню старых дробных калгасаў амаль не вядзецца, а працаўнікі Хоцімскага райёну нават настроены супроць узбуйненьня. Недастатковая ўвага па некаторых райёнах зьвяртаецца на сацыяльны падбор асабовага складу калгасаў, у выніку чаго ёсьць выпадкі, калі ў склад калгасаў прымаюцца заможныя.

Акруговым плянам таксама намечана ў часе вясеньняй пасеўнай кампаніі арганізаваць: 12 машынных таварыстваў, 1 насеннаводнае т-ва, 17 садовых артэляў, 5 садаводных таварыстваў, 3 пчалярныя, 4 насяльковыя, 38 малочных і жывёлаводных таварыстваў. Да паловы сакавіка гэты плян выканан па арганізацыі малочных і жывёлаводных на 65 проц., а на астатніх вытворчых аб'яднаньнях с-г. каапэрацыі—на 25 проц.

Гаворачы аб калектывізацыі і каапэраваньні вёскі, неабходна спыніцца на каапэраваньні беднаты. Плянамі прадугледжана каапэраваць за лік спэцыяльных фондаў у калгасы 136 бядняцкіх гаспадарак, а ў іншыя вытворчыя аб'яднаньні с.-г. каапэрацыі—5757 бядняцкіх гаспадарак. На 1-га сакавіка гэтыя пляны выкананы: па каапэраваньню ў калгасы—на 15 пр., а па каапэраваньню ў іншыя аб'яднаньні—на 12,8 проц. Водлуг даных АКРЗА, у с.-г. крэдытных таварыствах ёсьць 30.000 руб. не скарыстаных на каапэраваньне беднаты. Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што каапэраваньню беднаты ў райёнах не аддаецца належная ўвага, і няма сталай працы з беднатой.

Як недахоп, трэба адзначыць, што сельсаветы спазьніліся са складаньнем сьпісаў беднаты для здавальненьня яе насеньнем, машынамі і інш., і што гэтыя сьпісы не абгавораны на групах беднаты, а таксама не пагоджаны з с.-г. каапэрацыяй.

У часе вясеньняй пасеўнай кампаніі намечана закантрактаваць па Магілеўскай акрузе розных культур на плошчы 11.620 гэктараў. Ня гледзячы на т

НА ШЛЯХУ БУДАЎНІЦТВА НОВАЙ ШКОЛЫ.

Больш рашуча рэагаваць на хваравітыя праявы сярод асьветнікаў

У сучасны момант савецкая грамадзкасьць згуртавала сваю ўвагу на адным вельмі важным і неадкладным пытаньні—гэта на чыстцы савецкага апарату. Мэта чысткі заключаецца ў тым, каб вызваліць наш апарат ад усяго наносного, шкоднага, што жыве ў апараце, разьдае яго, не дае магчымасьці іншы раз праводзіць правільную клясава-вытрыманую лінію і вырашаць тыя задачы, якія высоўваюцца сучасным пэрыядам сацыялістычнага будаўніцтва. Чыстка савецкага апарату павінна будзе ахапіць усе адміністрацыйныя і гаспадарчыя ўстановы.

Мы маем шматтысячную масу культасьветных працаўнікоў, з якіх большасьць сумленна, аддана працуе на карысьць рабочае клясы і працоўнага сялянства. Аднак, некаторая частка, значна меншая, мае ў сваіх шэрагах такі элемэнт, ад якога сапраўды трэба было-б вызваліць нашы культасьветныя ўстановы.

Мы тут ня зьбіраемся ўстанаўліваць формы і мэдаты вызваленьня школы, хаты-чытальні, лікпункту і г. д. ад варожых элемэнтаў, мы не прапануем чысткі, як мэтады перагляду ўсяго складу працаўнікоў культасьветных устаноў, аднак, узмацненьне ўвагі хваравітым зьявішчам, якія назіраюцца у працы культасьветных устаноў і якія зьяўляюцца прадуктам працы варожых элемэнтаў, надзвычайна неабходна. Вось чаму нам здаецца, без хірургічнага адсячэньня паасобных адзінак працаўнікоў культустаноў таксама нельга будзе абыйсьціся.

Сапраўды, ці можна пакінуць працаваць у школе асоб, якія пазбаўлены выбарчых правоў? Як можа такая асоба выкладаць нашу канстытуцыю? А між тым асобы, пазбаўленыя выбарчых правоў, у нашых школах ёсьць. Далей, у нас ёсьць асобы, у галовах якіх сядзіць яшчэ рэлігійны дурман. Калі такая асоба можа працаваць у адміністрацыйнай установе, дык да выхаваўчай працы ні ў якім разе ле нельга дапусьціць. «Дэмакратычныя» амэрыканцы ў 1927 г. з прычыны выкладаньня дарвінізму адным настаўнікам стварылі судовы так званы «абезьляні» працас, якім прагрымелі на ўвесь сьвет, а мы павінны цацкацца з насіцелямі рэлігіі, гэтага ворага культуры і навукі.

Вось перада мною ляжыць афіцыйны дакумант, пратакол нарады сакратароў РМК Бабруйскай акругі. Прадстаўнік Рагачэўскага райёну кажа, што «адзін настаўнік гаварыў аб непатрэбнасьці кіраўніцтва партыі»; „некаторыя настаўнікі выступалі супроць беднаты“ у часе перавыбараў саветаў (Глускі райён); „ёсьць моманты антысэмізму з боку настаўнікаў» (Слуцкі р.); „ёсьць аналітычнасьць з боку некаторай часткі настаўніцтва асабліва заможнага“ (Асіпавіцкі р.); «ёсьць выпадкі, калі настаўнік выступае супроць надзелу вучняў на беднякоў і кулакоў» (Старадарожскі р.) і г. д.

Можна было-б прывесьці шэраг аналёгічных фактаў і з іншых округ, але і гэтага досыць, каб паставіць больш рашуча пытаньне аб узмацненьні кантролю з боку савецкай грамадзкасьці над працаю школы і аб адсячэньні тых элемэнтаў, якія працуюць у нашых культасьветных установах і сваёю працаю прыносяць не карысьць, а шкоду.

Усіх тых, хто недастаткова сьвядомы, трэба імкнуцца перавыхоўваць, а яўна варожы элемэнт, шкодны для ажыцьцяўленьня задач культурнай рэвалюцыі, трэба адсячы. У гэтым зацікаўлена сама асьветніцкая маса, гэтага патрабуе і праца нашых культасьветных устаноў. Яз. Мацюкевіч.

Ці настаўнікі благія, ці сам РВК шкодзіць справе?

(Калінкавічы, Мазыршчына).

— Дрэнныя ў нашым райёне настаўнікі, ня прымяюць удзелу ў грамадзкай працы і ў школах працуюць дрэнна,—кажа старшыня Калінкавіцкага РВК т. Кузьмітовіч на райзьезьдзе саветаў.

— У нашым райёне нават ёсьць тры настаўнікі, пазбаўленыя выбарчых правоў і агульны склад настаўнікаў дрэнны,—працягвае далей т. Кузьмітовіч. Зьвернемся цяпер да складу настаўнікаў.

У райёне звыш 60 настаўнікаў, з якіх 28 скончыўшых пэдтэхнікумы, з іх многа камсамольцаў. 14 настаўнікаў са спэцыяльнай настаўніцкай адукацыяй выходцаў з сялян і астатнія з рознай адукацыяй, сярод якіх таксама многа выхадцаў з блізкіх да пралетарыяту сямей.

Я нядаўна працую ў Калінкавіцкім райёне і ведаю толькі 20 настаўнікаў, з якіх толькі 3 не адпавядаюць годнасьці настаўнікаў. Праўда, адны працуюць лепш, другія горш, але ня ўсе ж умеюць працаваць добра, трэба навучыцца.

Ніхто ня будзе спрачацца, што ў райёне, па фронце асьветы ўсё добра. Не, ёсьць трохі гнілі і сярод настаўнікаў, але трэба таксама зазначыць, што і ў РВК ня ўсё, як сьлед.

РВК у гэтым годзе прызначыў на пасаду настаўніка у Хоміцкую школу Дровіка, пазбаўленага выбарчага права, клясавага ворага, а потым кажа, што ў райёне шмат благіх настаўнікаў. На вошта-ж прызначаеце?

У час справаздачнай кампаніі сябра РВК Новікаў перад сялянамі выступае і крые настаўнікаў такімі словамі, што брыдка пісаць, а адносна агранома-жанчыны, дык сказаў: «Трэба будзе прагнаць, бо яна нікуды ня вярта»

Ці-ж гэта дапусьціма?

Прыехаў я аднойчы ў РВК і пашоў да старшыні пагутарыць адносна арганізацыі калгасу, але зрабіць мне гэта не ўдалося, бо старшыня мне сказаў, стаўшы ў позу генэрала:

— „Не парыце гарачкі, няхай сяляне лепш некалькі раз да нас прыдуць, а то яны не абдумаўшыся арганізуюцца, а потым раскідаюцца,—і за кожным словам пастукваў па сталу. Адрэзовіў коратка і цьвёрда.

Я ехаў з радасьцю ў РВК, думаў парадзіцца са старшынёю аб далейшай маёй працы як настаўніка, як памоцніка партыі і ўлады на вёсцы.

А мяне замест гэтага, замест чака нага, аблілі сьцюдзёнай вадой.

Нельга прывесьці ўсіх фактаў, але агульна Калінкавіцкаму РВК трэба зьмяніць тактыку, і хібы ў працы настаўніцтва значна выправяцца. В. А.

ПАРА ПАКОНЧЫЦЬ З МОРДАБОЙСТВАМ У ШКОЛЕ

(Вульскі райён, Полаччына).

Дагэтуль яшчэ шмат у якіх школах Полаччыны наглядаюцца выпадкі мордабойства. Такіх выпадкаў у адным толькі Вульскім райёне было зафіксіравана 5

Апошні выпадак біцьця вучняў, як і прышлося сустрэць, адбыўся ў Вульскім райёне ў Вобальскай школе. Настаўнік, загадчык гэтае школы, зьбіў вучня II групы за яго дрэнныя паводзіны, на якія паскардзілася настаўніца гэтай групы Пятухова—жонка загадчыка.

Не разабраўшыся ў сутнасьці справы, давяраючыся гэтым скаргам, настаўнік зьбівае і выганяе самаўласна вучня групы. Так ён «замацоўвае» дысцыпліну. Гэта-ж адбываецца і ў іншых групах, якія вядзе сам Пятухоў. Ён б'е вучняў на кожным кроку і за кожнае «азарство».

Ці-ж можа школа пры такім становішчы нармальна працаваць? Бязумоўна, не. Гэта разлагае настрої вучняў, асабліва старшых груп, прымушае іх у адместку ісьці на розныя хітрыкі, каб ашукаць і зьяважыць настаўніка. Л. Б-скі.

ШКОЛА--ГАЛОЎНЫ РАССАДНІК БЯЗБОЖНІЦТВА

Настаўніцтва яшчэ не ўзварухнулася.

Бязбожніцкія арганізацыі ў Амсьціслаўскім райёне існуюць некалькі год, але праца іх за гэты час пасунулася наперад слаба. Арганізавана 8 ячэек, з якіх адна пры доме асьветы, адна пры саюзе харчавікоў, адна камсамольская, адна пры пэдтэхнікуме і адна пры пэдкурсах і толькі дзьве вясковыя. Пры сямігадовых школах гораду і ў Шамаве арганізаваны вучнёўскія антырэлігійныя гурткі пад кіраўніцтвам настаўнікаў. У склад ячэек уваходзіць, галоўным чынам, моладзь, студэнцтва і вучнёўства.

Наогул, удзел культасьветных устаноў у антырэлігійнай працы слабы. Пры сямігодках, праўда, існуюць гурткі, але па-пазашкольнай працы яны не выдуць, пакуль-што абмяжоўваюцца тэарытычнымі расправаўкамі на пляну навукова-мэтадал. камітэту НКА. Пры вясковых школах няма і гэтага. Пры абгляде працы школ райённым мэтадычным бюро высьветлілася, што школы на вёсцы, ды і ў горадзе, не ўявілі сабе неабходнасьці весьці антырэлігійную працу і ўвязваць яе з комплексным матар'ялам.

На аточшняй асьветніцкай райконфэрэнцыі ставіўся спэцыяльны даклад на тэму—«Антырэлігійнае выхаваньне».

але шмат вясковага настаўніцтва ужо разьехалася па хатах. Спрэчкі высьветлілі, што настаўнікі слаба падрыхтаваны для такой працы.

Праца існуючых бязбожніцкіх арганізацый носіць кампанейскі характар, калі даклады прыстасоўваюцца да тых ці іншых рэлігійных сьвятаў. Плянавасьць і сыстома адсутнічаюць. Масавыя даклады як у горадзе, так і на вёсцы адсутнічаюць.

Духоўнікі правялі самаабкладаньне на рамонт царквы. Райённы савет бязбожнікаў прамаргаў гэта зьявішча і толькі потым накіраваў у вёскі сваіх сяброў дзеля належных тлумачэньняў

Выпіска антырэлігійнай літаратуры па школах гораду павялічылася.

Вясковае настаўніцтва павінна ў тэрміновым парадку ўзяцца за працу па арганізацыі ячэек бязбожнікаў, уцягнуць у антырэлігійную працу найбольш актыўных жанчын-дэлегатак. Зараз ідзе вялікі пост, набліжаецца вялікдзень і вясновыя рэлігійныя сьвяты. Настаўніцтва ў шчыльнай сувязі з хатнікам, бібліятэкарам, агранонам, доктарам, павінна рашуча выступіць на барацьбу в рэлігійным дурманам.

(Амсьціслаўскі райён, Аршанскай акр.). М—а.

Настаўніцтва--на антырэлігійны фронт.

((Крупскі р., Аршанскай акругі).

1-2 сакавіка адбыўся агульны сход асьветнікаў Крупскага райёну, на якім прынята наступная рэзалюцыя:

1. Лічыць неабходным зьвярнуць больш увагі на інтэрнацыянальнае і антырэлігійнае выхаваньне ў школах.

2. Зьвязываць гэту працу з пазашкольнай працай сярод акаляючага працоўнага насельніцтва, у першую чаргу сярод бацькоў вучняў.

3. Усім настаўнікам уступіць у саюз бязбожнікаў актыўнымі членамі; у тых сельсаветах, дзе яшчэ не арганізаваны ячэйкі бязбожнікаў, арганізаваць іх, усклаўшы адказнасьць за арганізацыю іх на ўпаўнаважаных.

4. К наступнай канфэрэнцыі асьветнікаў прыстасаваць і канфэрэнцыю саюзу бязбожнікаў, аб чым дагаварыцца з арганізацыяй бязбожнікаў.

5. Узьняць пытаньне ў друку аб утварэньні на старонках газэт хоць-бы раз у тыдзень кутка бязбожніка дзеля абмену вопытам і дасягненьнямі на антырэлігійным фронце.

6. Гуртаваць думку працоўнага насельніцтва райёну вакол пытаньня аб зачыненьні пэркваў, сынагог і касьцёлу.

7. Узьняць думку аб скасаваньні рэлігійных сьвят, і ў календарох іх зусім не адзначаць.

8. У працягу сакавіка кожнай школе паставіць на бацькоўскіх сходах пытаньне антырэлігійнага выхаваньня дзяцей.

9. На наступнай канфэрэнцыі паставіць пытаньне інтэрнацыянальнага і антырэлігійнага выхаваньня паасобку ў больш практычнай форме, дзеля абмену вопытам.

10. Лічыць, што ў шэрагах асьветнікаў не павінна быць рэлігійнікаў і што ў гэтым адстаючай часткі асьветнікаў неабходна зараз-жа разабрацца.

11. Не прапускаць ніводнага выпадку праяўленьня рэлігійнасьці ў шэрагах асьветнікаў, у іх быту і асьветніцкай працы.

Настаўнік Цітавец.

Рыхтуемся да вялікадня.

(Чэрвенскі райён, Меншчына).

Антырэлігійнае выхаваньне ў большасьці школ Чэрвенскага райёну пастаўлена досыць слаба.

У школах ёсьць праграма па антырэлігійным выхаваньні, якая грунтуецца галоўным чынам на выкладаньні грамадазнаўства, прыроды, геаграфіі, фізыкі.

Галоўныя моманты ў працы: тэорыя Дарвіна, паходжэньне рэлігіі, клясавая роля царквы ў падтрыманьні ўлады прыгоньнікаў, 9 студзеня 1905 г., хімія, біцьцё на забабонах пры дапамозе краязнаўчага матар'ялу і інш.

Праводзяцца антырэлігійныя кампаніі перад рэлігійнымі сьвяткамі.

Пры некаторых школах існуюць антырэлігійныя гурткі, якія стала праводзяць свае заняткі.

Дзякуючы сталаму правядзеньню антырэлігійнай працы ў школах мы маем тое, што дзеці вусім не наведваюць царкву, сынагогу, касьцёл. Вучні ў рэлігійныя сьвяты акуратна наведваюць школу. Яўрэйскія дзеці стала наведваюць школу па суботах, у суботу пішуць.

Зараз вядзецца падрыхтоўчая праца да растлумачэньня сутнасьці вялікадня.

М. Процька.

Гурток разваліўся.

У мінулым годзе пры Доме Асьветы думалі заснаваць гурток бязбожнікаў. Абгаварылі пытаньне, абвясьцілі запіс жадаючых працаваць у гэтым гуртку. Некаторыя настаўнікі пачалі запісвацца і ўносіць сяброўскія ўносы.

Прашоў год. Аб працы гуртка—ні слуху, ні духу. Як відаць, мала запісалася ў гурток і ня было з кім распачынаць працу.

Гэта сьведчыць аб тым, што большасьць настаўнікаў лічыць існаваньне такога гуртка непатрэбным. Гэта, відаць, зьявілася і асноўнай прычынай таго, што гурток ня выявіў ніякай працы і ліквідаваўся.

Трэба сурёзна задумацца над гэтым і ў гэтым годзе зноў арганізаваць гурток і наладзіць у ім працу. К—ч.

(Слуцак).

Вучні-бязбожнікі.

(м. Ляды, Аршанчына.)

Пры ляднянскай сямігодцы з пачатку навучальнага году заснаваўся гурток бязбожнікаў. З пачатку арганізацыі гурток зараз-жа распачаў працу. За тэрмін кастрычнік—сакавік ён правёў шмат сходаў. На гэтых сходах ставіліся такія пытаньні, як „Рэлігія--закабаленьне працоўных». «Папы і іх мана“.

Гурток налічвае хаця 50 вучняў са старэйшых клясаў—4, 5, 6 і 7.

Гуртком кіруе настаўнік беларускай мовы.

Сябры гуртка не абмяжоўваюцца толькі тым, каб здабыць веды толькі для сябе, але яны вядуць належную працу і сярод насельніцтва, сярод сваіх бацькоў.

Гурток выпісвае газэту „Бязбожнік“, а таксама і бібліятэку бязбожніка.

Цім. Вір.

ДАПАМАГАЕМ ПАДШЭФНАЙ ВЁСЦЫ.

Пры Коханаўскай сямігадовай школе і навучальна-практыкавальнай майстэрні (Аршанскай акр.) існуе пэфскае таварыства, якое абслугоўвае в. Ляўкова, Коханаўскага сельсавету. Т-ва праводзіць сялянскія сходы з удзелам агранамі па пытаньнях узьніцьця ўраджайнасьці, абгаварэньня новага закону аб с.-г. палатку і аб агракультурных мерапрыемствах улады.

Сялянства на сходзе 24-3 пастанавіла ачысьціць насеньне на 100 проц. і пратруціць яго перад севам.

Праз коханаўскую навуч. практыкавальную майстэрню будзе 17 гаспадаркам дарэмна адрамантаваны сельска-гаспадарчы інвэнтар (плугі, бароны і інш.) на суму 28 р. 50 к., для калектыўнага карыстаньня будуць зроблены 2 лейкі для пратручваньня насеньня і 1 акучнік, усё гэта каштуе 14 рублёў.

Па клясах і інтэрнатах сямігодкі і навучальна-практыкавальнай майстэрні ідзе збор попелу, які будзе перададзен адной з бядняцкіх гаспадарак вёскі Ляўкова. Ан. Бяляў.

10 ПЛУГОЎ ДЛЯ СЯЛЯН-БЕДНЯКОЎ.

Вучні менскай аб'яднанай прафтэхшколы наладзілі збор попелу ў школе, а некаторыя і дома. Для сялян-беднякоў падшэфнай вёскі куплена 10 плугоў. Кошт гэтых плугоў вучні адпрацавалі ў майстэрнях у звыштэрміновым парадку. У часе выезду да падшэфнікаў праводзілі гутаркі аб падвышэньні ўраджайнасьці, аб ачыстцы збожжа і г. д.

А. Стонік.

ЭСТЭТЫЧНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ У ЗАНЯПАДЗЕ.

Калі да сучаснага моманту ў пачатковых школах вёскі мы маем досыць добрую мэтодыку навучаньня дзяцей чытаць і пісаць, дык у запатрабаваньнях эстэтычнага характару школа амаль што нічога ня мае.

Праяжджаючы па райёнах Жыцькаўскага, К.-Слабодзкага і Бытчанскага с-саветаў Барысаўскага р-ну прышлося наглядаць адсутнасьць эстэтычнага выхаваньня, якое напэўна не праводзіцца рэгулярна ніводнай з пачатковых школ іншых райёнаў. Мала таго, што мы навучыліся больш-менш задавальняць вучняў чытаньнем і пісьмовымі працамі, — маляваньне і сьпевы таксама неабходны для дзяцей. Пажаданы сцэнічныя прадстаўленьні дзіцячых п'ес.

Што мы бачым у гэтай галіне зараз?

У нас да гэтага казённыя адносіны, настаўнікі ў часе маляваньня ці ад немажлівасьці, ці ад чаго іншага даюць маляваць дзецям з кніжкі, а апошнія пераздымаюць і псуюць сваё разьвіцьцё і кніжкі. Сьпеваў і пастановак наогул на чуваць.

Як палепшыць гэту справу?

Па-мойму трэба браць спачатку; як элемантар з гукаў, маляваньне з простых палак, потым з валікаў, потым яшчэ складней, а пасьля надаць ім контуры рэчаў (сшыткаў, конаўкі для вады і інш. простыя рэчы). Гэтым спосабам можна паставіць на карысны шлях маляваньне дзяцей і іх разьвіцьцё. Навучаньне дзяцей маляваць простыя рэчы з натуры—гэта моцны грунт для далейшага разьвіцьця.

Адносна сьпеваў. Малыя вучні ўмеюць сьпяваць вайсковыя сьпевы, сьпевы, пачутыя на вячорках; дзяўчаткі захапляюцца вясельнымі сьпевамі, сьпевамі «кірпичиков» рознага зьместу, а іншыя і зусім нічога ня ўмеюць, іхныя галасы-званочкі марнеюць дарма. А нашы дзіцячыя сьпеўнікі, беларускія сьпеўнікі, ляжаць нескарыстаным.

Арганізацыя маленькага дзіцячага хору пры школах, гурткоў дэклямацыі і пастановак дасьць вялізарны эфэкт у справе эстэтычнага выхаваньня.

Трэба глыбей і шырэй узьнімаць дзіцячыя здольнасьці і жаданьні. С. К.

Кожны настаўнік павінен быць пэдалёгам.

Жыцьцё вымагае таго, каб кожны настаўнік быў пэдалёгам. Дзеля набыцьця асноўных ведаў па пэдалёгічнай працы і пэдалёгічнаму практыкуму трэба пры школьных калектывах сямігадовых школ пэршага канцэнтру, пры дамах асьветы і наогул пры ўсіх іншых нават маленькіх асьветніцкіх згуртаваньнях акруговага або райённага маштабу стварыць пэдалёгічныя сэмінары дзеля літаратурнай і практычнай прапрацоўкі асноўных тэм па пэдалёгіі.

Задачы такога сэмінару-гуртка павінны быць наступныя: 1. Знаёмства з біялёгічнымі, псыха-фізыялёгічнымі асаблівасьцямі дзіцячага арганізму ў розных пэрыядах дзяцінства. Вывучэньне псыхалёгіі дзяцінства 2. Прапрацоўка асобных пэдалёгічных праблем (дзіцячыя гульні, інтэрэсы, ідэалы; дзіцячыя малюнкі: досьледы моўнага апарату дзіцяці, яго думаньня, кола ўяўленьняў, выабражэньня, мастацкай дзейнасьці, абхвату і тыпу памяці, увагі, назіральнасьці, усырыймальнасьці і г. д. 3. Падзяканьне навуковага базісу, выхаваўчай сыстэмы пад практычную штодзённую працу пэдагога. 4. Знаёмства з найбольш элемэнтарнымі мэтадамі па складаньню псыхічнага фармуляру дзіцяці. 5. Знаёмства з антропомэтрыяй дзеля фізычнага вывучэньня дзіцяці. 6. Мэтадалёгія сацыяльна-бытавога досьледваньня акаляючага асяродзьдзя дзіцяці:—вывучэньне ўмоў жыцьця дзіцяці і іх уплыву на растучы арганізм. Складаньне табліцы эканамічнага дабрабыту сям'і дзіцяці, яго біо-сацыяльнага профілю. 7. Праца з пяжкімі ў справе выхаваньня дзяцьмі. Знаёмства з дэфэкталёгіяй і асновамі псыхапаталёгіі дзяцінства.

У працы сэмінару значна можа дапамагчы Пэдтэхнікум акругі ці раёну, які павінен весьці шырокую пэдалёгічную агітацыю і прапаганду. Пры Пэдтэхнікуме ёсьць пэдалёгічны габінэт, некаторыя прылады па антропамэтрыі, па дасьледваньню паасобных функцый псыхікі дзіцяці. Значную частку прылад Пэдтэхнікум можа па заўчах з месц распаўсюдзіць па мясцовых гурткох, райённых школах і г. д Студэнты Пэдтэхнікуму пры сваёй майстэрні зёгка гэта змогуць выканаць за нязначную плату.

Прыкладна, пры Аршанскім Пэдтэхнікуме, дзе існуе пэдалёгічны габінэт і школьная псыхатэхнічная лябараторыя, ідзе, праўда, пакуль у малым масштабе, выкананьне заказаў. Вось сьпіс прыладаў вырабляемых тэхнікумам, в паказаньнем кошту: тахістаскоп—апарат экспанатар на дасьледваньне ўвагі, памяці і г. д. уласная канструкцыя—кошт 20 руб., эстэзыомэтр—мэральнік чульлівасьці—5 руб., ольфактомэтр—нюхальны рэпэтар—8 руб., крупёлка для зьмешваньня колераў—3 руб., куб Лінкоўскі для дасьледваньня тэхнічнай здольнасьці, назіральнасьці, хуткасьці рэакцыі — 1 набор 4 руб., прылада на мышачную памяць—9 руб., просты вокамерны апарат—8 руб., прылада на геомэтрычную арыентыроўку—3 руб., эргомэтэр для выначэньня межавай сілы ціску—16 руб., стадыомэтр-ростамэр — 10 руб.

Кансультацыю Пэдтэхнікум можа праводзіць праз канфэрэнцыі настаўніцтва, пісьмовыя запытаньні і г. д.

Камплекты тэстаў кожны гурток можа дастаць з Менскай псыхатэхнічнай лябараторыі пры Інстытуце Аховы працы.

За кароткі час свайго існаваньня, дзякуючы энэргічнай працы праф. Васілейскага і яго супрацоўнікаў, Менская псыхатэхнічная лабараторыя зрабіла шмат. Як вядома, амаль што ўсе Пэдтэхнікумы свой пэдалёгічны вопыт запазычылі адтуль.

М. Цэхановіч.

З лістоў.

— У Гомельскім райёне працуюць дзьве кіно-перасоўкі. Кіно-сэансы па вёсках станяцца як для дарослых, так і для дзяцей. На жаль, зьмест карцін не заўсёды адпавядае дзіцячаму разуменьню.

— Чачэрская 9-цігадовая школа (на Гомельшчыне) разгарнула працу па ліквідацыі нянісьменнасьці. Працуе 90 вучняў, якія ў індывідуальным парадку ахапілі звыш 100 нянісьменных.

— Самахвалавіцкі РВК выдаў некаторым школам дровы за 20-25 кілёмэтраў, у выніку чаго дровы некаторых школ апраналі. Напрыклад, Кайкаўская школа змагла забраць толькі палову сваіх дроў.

Наша перапіска.

М. Дрыса. У сваім артыкуле «Яшчэ аб антырэлігійнай працы ў школе» вы нічога новага не сказалі. Друкаваць ня будзем.

А. ЧЫРВОНАМУ І А. ВЯЛІКАМУ. Полацак. Ваш допіс наконт выкладчыка сьпеваў Замулкі пераслалі ў рэдакцыю газэты «Зьвязда».

Я. ШМЯЛЮ. Рагачоў. З вашага „Маленькага фэльетону“, на жаль, нічога нельга зразумець. Пішыце прасьцей. „Два прыклады“ пераслалі ў Рагачоўскі РВК.

П. КАЗЬЯНІНУ. Полаччына. Ваш допіс «Віцебскі Белпэдтэхнікум» пераслалі ў Наркамасьветы.

ПЕРАШКОДЫ Ў ПРАЦЫ ГАРАДЗКОЙ ШКОЛЫ.

ШМАТЛЮДНАСЬЦЬ, РОЗНАСТАЙНАСЬЦЬ УЗРОСТУ ВУЧНЯЎ, ДВУХЗЬМЕННАСЬЦЬ У ГАРАДЗКІХ ШКОЛАХ.—САЦЫЯЛЬНАЯ РАЗНАШОРСТНАСЬЦЬ ВУЧНЯЎ, НЕНАЛАДЖАНАСЬЦЬ ПРАЦЫ З БАЦЬКАМІ.—ПРАЦОЎНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ.--СКЛАДАНАСЬЦЬ ГРАМАДЗКА-КАРЫСНАЙ ПРАЦЫ.

Наш пэдагагічны друк пераважную ўвагу аддае вясковай школе, высьвятляе асаблівасьці працы пераважна вясковага настаўніцтва. І гэта зусім зразумела: вясковых школ у нас непараўнана больш, чымся гарадзкіх, вясковае настаўніцтва тэрытарыяльна раскідана, і працаваць яму прыходзіцца ў вельмі цяжкіх абставінах,—таму вясковай школе і патрэбна падтрыманьне ў першую чаргу,

Але і гарадзкая школа мае свае цяжкасьці і перашкоды ў працы, якія бязумоўна вымагаюць да сябе ўвагі. Аб гэтых цяжкасьцях гарадзкой школы чамусьці мала гаворацъ, голасу гарадзкога настаўніка-масавіка ў нашым друку амаль што ня чуваць. А між тым, у нашых умовах, у пэрыяд стварэньня новай школы, надта важна своечасова высьвятляць усе хібы і перашкоды дзеля зьнішчэньня іх супольнымі сіламі ўсяго настаўніцтва і грамадзкасьці.

Чым з арганізацыйнага боку адрозьніваецца гарадзкая школа ад вясковай? Перш за ўсё тым, што гарадзкія школы ў большасьці вялікія, шматлюдныя, маюць шмат груп. Колькасьць вучняў у іх дасягае некалькіх сот, а у некаторых даходзе і да тысячы. Добра гэта, ці блага? Патрэбна ці непатрэбна некаторая няжа ў росьце школьнага арганізму? Якой велічыні павінен быць дзіцячы калектыў, каб з большым посьпехам магчыма было дасягнуць нашых выхаваўчых задач, каб паасобнае дзіцянё не тапула ў агульнай масе і каб яму забясьпечана была належная ўвага? Гэтыя пытаньні яшчэ ня вырашаны, а між тым яны надта даюць сябе адчуваць у працы гарадзкіх школ.

Гарадзкія школы ў большасьці сямігодкі, дзе ёсьць дзеці ўсіх узростаў, пачынаючы ад 7-8 гадоў і канчаючы 18 і нават 20-гадовымі юнакамі. Ня гледзячы на такую рознастайнасьць ва ўзросьце, для ўсіх вучняў тут заведзены адзін унутраны распарадак: аднолькавая працягласьць лекцыі, перамешкі і г. д.

Як адбіваецца такое злучэньне першага і другога канцэнтру на выхаваўчых задачах школы, на дысцыпліне, у чым спрыяе такое злучэньне і дзе яно шкодзіць працы?

Значная большасьць гарадзкіх школ займаецца ў дзьве зьмены, а некаторыя і ў тры. Пры такіх умовах вучань бывае ў школе ня больш 3-5 гадзін у дзень, для пазашкольных заняткаў належных умоў няма, дзіцянё большую частку дня праводзе ў сям'і і асяродзьдзі вуліцы, і таму выхаваўчы ўплыў школы значна паслабляецца. Ад двузьменных заняткаў гарадзкая школа, разумеецца, ня так яшчэ хутка вызваліцца, але пытаньні аб тым, як лепш прыстасаваць школу да двухзьменных заняткаў, як лепш арганізаваць лекцыі, працу вучнёўскіх аб'яднаньняў і інш.,—гэтыя пытаньні патрабуюць неадкладнага вырашэньня калектыўнымі патугамі ўсяго настаўніцтва.

Надта ўскладняе працу гарадзкіх школ і вялікая рознастайнасьць у сацыяльным складзе вучняў. Блізка што ў кожнай гарадзкой школе вучацца дзеці самых рознастайных сацыяльных пластоў насельніцтва: рабочых, сялян, саматужнікаў, служачых, гандляроў, нэпманаў. Гэта рознастайнасьць вымагае ад настаўніка і розных прыёмаў і спосабаў уплыву на вучняў. Кожнае дзіцянё прыходзе ў школу са сваімі нахілямі, са сваімі сямейнымі адзнакамі ў выхаваньні. Гарадзкая школа мае справу ня толькі з рознастайнымі групамі вучняў, але ў значнай частцы і з пасаванымі дзецьмі.

Вясковая школа, бязумоўна, таксама не пазбаўлена клясавага расслаеньня, і там дзеці прыходзяць у школу выяўлены элемэнт клясавасьці ў справе выхаваньня і ў сацыяльным складзе вучняў.

Вясковая школа, праводзячы ў сабе сацыяльны адбор пры пераходзе вучняў з першага канцэнтру ў другі, хутка зусім вызваліцца ад варожага элемэнту і стане аднастойнай, строга клясавай школаю, у адносінах-жа да гораду гэтага пакуль што сказаць нельга, бо тут справа з гэтага боку стаіць куды горш.

Вось чым тлумачыцца тое, што ў некаторых школах гораду выбухаюць ганебныя здарэньні, парушаючыя працоўную дысцыпліну, парушаючыя нармальнасьць жыцьця і працы школы.

Цікавыя здарэньні хваляй пранесьліся па шэрагу менскіх школ за апошні год.

Такія здарэньні мелі месца і ў 5-й савецкай школе гораду Менску, расейскай школе, налічваючай у сваім складзе каля тысячы вучняў, разнастайных як па нацыянальным, так і па сацыяльным складзе.

Канспіратывізм—«не выдавай сваіх»—надзвычайна пашыраны сярод паасобных клясаў школы і падтрымліваецца вучнямі як піанэрамі, так і камсамольцамі.

Таму выявіць віноўніка таго ці іншага здарэньня надзвычайна цяжка.

Некаторыя «дробязі» мелі месца на працягу году ў 7-б клясе, і пры вылуленьні вінаватых у некаторых учняў як не ўдалося зусім выявіць.

У 2-ой роўналеглай клясе практыкаваліся падпальваньні прывязаных ззаду да рубашкі паперак, занос у школу літаратуры па палавому пытаньню і падкрэсьліваньне больш «сакавітых» месц дзеля належнае ўвагі таварышоў і яшчэ некаторыя моманты, носячы разлагаючы характар. На апошнім пасяджэньні школьнай рады прышлося ставіць пытаньне аб прабываньні ў школе некаторых з вучняў клясы, і аднаго з іх, як праводзячага разлагаючую працу і арганізатара нездаровых зьявішч, выключыць са школы, як сацыяльна нездаровы элемэнт (вучань паходзіць з сям'і дамаўласьніка, былога гандляра), іншым, што дапамагалі яму, зроблена папярэджаньне.

Школа і савецкая грамадзкасьць павінны ўжыць усе захады да ўзьняцьця ў школе працоўнае дысцыпліны, без якой аніякая прадукцыйная праца нямысліма.

У першую чаргу трэба аддаць самую пільную ўвагу пытаньням сацыяльнага аздараўленьня нашай школы.

Асьветнік.

Цяжка дасецца грамадзка-карысная праца,—трэба скарыстаць вопыт тых школ, якія ўжо дабіліся некаторых дасягненьняў, трэба вучыцца на гэтым вопыце і супольнымі сіламі стварыць мэтодыку гэтай працы.

Цяжка зрабіць школу зброяй ідэйнага, арганізацыйнага і выхаваўчага ўплыву на непралетарскія і поўпралетарскія пласты вучнёўства,—трэба больш выразна і паступова праводзіць клясавую лінію ў школе, трэба яшчэ мацней абаперціся ў гэтай справе на піанэрскія і камсамольскія арганізацыі. Урэшце трэба павесьці плянавую і сыстэматычную працу з бацькамі, і ў гэтай працы больш улічваць клясавыя моманты.

Даюць сябе адчуваць некаторыя арганізацыйныя моманты,—трэба гаварыць аб іх на сходах, канфэрэнцыях; трэба гаварыць аб тым, калі выгадней пачынаць працу пры дзьвюхзьменных заняткох, як прыстасаваць клясную мэбляу да абслугоўваньня розных зьмен і г. д.

Вопыт тых школ, якія дабіліся значных посьпехаў у вырашэньні ўсіх гэтых хібаў і цяжкасьцяў, трэба шырока скарыстаць усім іншым школам. Дзеля гэтага трэба шырэй разгарнуць абмен вопытам як на настаўніцкіх сходах і канфэрэнцыях, так і ў нашым друку.

Пытаньні, звязаныя з будаўніцтвам новай працоўнай школы, павінны прыцягнуць самую пільную ўвагу ўсяго нашага настаўніцтва і грамадзкасьці. Супольнымі сіламі зьнішчым усе цяжкасьці на шляху будаўніцтва новай школы

Я. П.

ТОЛЬКІ ДЗЯРЖАЎНАЕ СТРАХАВАНЬНЕ МОЖА ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПЛЯНАВАЕ РАЗВІЦЬЦЁ КОЖНАЙ ГАСПАДАРКІ.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова
Савету Народных Камісараў БССР

па дакладу Народнага Камісарыяту Фінансаў аб скарыстаньні прызначэньняў на фінансаваньне сельскае гаспадаркі па дзяржаўнаму бюджэту БССР на 1927-1928 г.

Выслухаўшы даклад Народнага Камісарыяту Фінансаў аб скарыстаньні прызначэньняў на фінансаваньне сельскае гаспадаркі па дзяржаўнаму бюджэту БССР на 1927-28 г., Савет Народных Камісараў БССР адзначае:

Укладаньні ў сельскую гаспадарку за рахунак дзяржаўнага бюджэту БССР і мэліяцыйнага крэдыту, якія правезены праз систему сельска-гаспадарчага крэдыту, павялічыліся ў 1927-28 годзе ў параўнаньні з мінулым годам на 40 проц.; умовы крэдытаваньня з фонду беднаты зьменены ў бок наданьня далейшых льгот бядняцкаму насельніцтву; прасоўка крэдытаў праз банкаўскія ўстановы системы палепшылася; у разьмеркаваньні крэдытаў бяруць сталы ўдзел органы Народнага Камісарыяту Земляробства, Белсельсаюзу, Белкалгасаюзу і Цэнтральнага Камітэту сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі ў выкананьне пастановы СНК Белсельбанкам выдалзены канкрэтна распрацаваныя практычныя дырэктывы аб скарыстаньні фонду беднаты

Разам з тым у крэдытнай рабоце, асабліва сельска-гаспадарчых крэдытных таварыстваў, меўся шэраг недахопаў: наглядалася недастаткова пляновасьць у разьмеркаваньні крэдытаў; недастаткова выкананы сыстэмай сельска-гаспадарчага крэдыту дырэктывы аб упарадкаваньні скарыстаньня спэцыяльных сродкаў, якія вымешчаны ў пастанове Эканамічнай Нарады пры СНК БССР за 23 мая 1927 г. «Аб выніках і прапановах праверкі скарыстаньня надзвычайных мэтавых крэдытаў і пастановах Савету Народных Камісараў БССР за 13-га лютага 1928 г. „Аб скарыстаньні фонду крэдытаваньня беднаты» і за 6-га красавіка 1928 г. «Аб скарыстаньні асигнаваньняў на фінансаваньне сельскай гаспадаркі ў 1926-27 г.«; у паасобных выпадках прадаўжалі наглядацца часам грубыя парушэньні правіл скарыстаньня фонду беднаты, як-та, накіраваньне яго не па прызначэньні, зьмяншэньне разьмеру пазычак, праз затрыманьне процантаў уперад, уступных і паявых унескаў і г. д., спагнаньне павялічанага разьмеру процантаў (да 10 проц.), выдача пазычак без наказаньня мэты прызначэньня, адсутнасьць сыстэматычнага нагляду за скарыстаньнем пазычальнікамі пазычак па прызначэньні; нявыпраўлены парушэньні, якія былі дапушчаны ў мінулыя гады; недазвальняюча ажыццяўляўся нагляд за работай нізавой сеці—рэвізійны плян аргуговых таварыстваў сельска - гаспадарчага крэдыту выканан на 39 проц; сыстэма справаздачнасьці не адбівае сапраўднага разьмеркаваньня крэдытаў паміж пазычальнікамі.

Для выпраўленьня паказаных недахопаў Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Фінансаў прыцягнуць да адказнасьці ўсіх асоб, вінаватых у парушэньні крэдытнай палітыкі і аб выніках паведаміць Савет Народных Камісараў.

2. Запрапанаваць акруговым выканаўчым камітэтам паведаміць Савету Народных Камісараў аб захадах, якія імі былі прыняты для выкананьня памянёных пастаноў Савету Народных Камісараў БССР за 13 лютага і 6-га красавіка 1928 г.

Запрапанаваць Бабруйскаму акруговаму выканаўчаму камітэту паведаміць Савет Народных Камісараў аб ходзе будаўніцтва крахмальнага заводу, а Полацкаму і Магілёўскаму акруговым выканаўчым камітэтам аб пабудове сельска-гаспадарчых майстэрняў, грошы на пабудову якіх былі адпушчаны яшчэ ў 1925-26 годзе.

3. Для таго, каб гадавы плян вытворчага крэдытаваньня, у метах перспэктыўнага пляну грунтаваўся на сапраўднай патрэбе сельскай гаспадаркі ў крэдыце,—даручыць Белсельбанку ўжыць рашучыя захады для палепшаньня якасьці заявак нізавой сеці і свачасовага іх паданьня. У гэтым напрамку ўзмацніць інструктаж з боку вышэйшых ўвеньняў сыстэмы.

4. Лічыць правільным уведзеную ў бягучым годзе сыстэму пабудаваньня крэдытнага пляну, якая прадугледжвае разьмеркаваньне прызначэньняў на грунах клієнтуры, даручыць Белсельбанку забясьпечыць арганізацыю падліку выкананьня плянавых заданьняў у гэтым напрамку.

5. Для таго, каб льготнае крэдытаваньне за рахунак спэцыяльных сродкаў у частны крэдытаваньня індывідуальных гаспадарак рабіліся ў парадку чэрговаасьці на падставе сацыяльна-клясавых прызнакаў, а не па меры выпадковага паступленьня заяў аб выдачы пазычак, даручыць Белсельбанку ўзмацніць папулярызацыю льготнага сельска-гаспадарчага крэдытаваньня праз друк, райённыя выканаўчыя камітэты, сельскія саветы і грамадзкія арганізацыі на вёсцы.

6. Для больш хуткага прасоўваньня крэдыту і плянавага разьмеркаваньня яго наладзіць папярэднюю рассылку ніжэйстаячым зьвеньням сыстэмы сельска-гаспадарчага крэдыту канкрэтнага каляндарнага расьпісаньня, пабудаванага на аснове крэдытнага пляну, на падставе чаго, наіменнае разьмеркаваньне крэдытаў было-б падрыхтавана да адчыненьня крэдытаў, а выдача пазычак магла-б мець месца непасрэдна пасьля іх адчыненьня.

7. Выходзячы з таго, што з прычыны недазвальняючай сыстэмы справаздачнасьці, Белсельбанк ня мае ведаў аб сапраўдным разьмеркаваньні крэдытаў на спэцыяльных сродках паміж непасрэднымі пазычальнікамі—даручыць Белсельбанку распрацаваць і па ўзгадненьні з Народным Камісарыятам Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі БССР належным чынам аформіць пытаньне аб палепшаньні сыстэмы справаздачнасьці на гэтых сродках у сельска-гаспадарчых крэдытных таварыствах.

У далейшым, у справаздачах аб дзейнасьці Белсельбанку і сыстэмы сельска-гаспадарчага крэдыту, пачынаючы з справаздачы за 1928-29 г. паказаць скарыстаньне спэцыяльных сродкаў да нізавой сеці ўключна, а таксама выкананьне дырэктыў і сводку данных аб выпраўленьні недахопаў, дапушчаных пры крэдытаваньні ў мінулым годзе. НКФ на Дзяржаўнаму Фінансаваму Кантролю адначасна даваць рэвізійную характарыстыку па справаздачы ў частнага скарыстаньня спэцыяльных сродкаў.

8. Даручыць Белсельбанку наладзіць сыстэматычнае папярэдняе абсьледаваньне гаспадарак, сыстэматычную наступную праверку сельскага-спадарчымі крэдытнымі таварыствамі з прыцягненьнем сельскіх саветаў і сялянскіх камітэтаў узаемадапамогі да скарыстаньня пазычак ва ўсіх без выключэньня гаспадарках, якія атрымалі пазычкі за рахунак спэцыяльных сродкаў, і падлік іх выпікаў. Вынікі праверкі папулярызаваць у друку.

9. Адзначаючы непадрыхтаванасьць клієнтуры да скарыстаньня крэдыту на насеннаводзтва, які быў скарыстан у 1927-28 годзе ледзь у разьмеры 50 проц. меўшыхся сум,—запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства БССР зьвярнуць асаблівую ўвагу на гэтую галіну. Прыняць да ведама заяву Народнага Камісару Земляробства аб тым, што пытаньне аб мерапрыёмствах у гэтым напрамку ім распрацаваны і ўнесены на разгляд Эканамічнай Нарады пры СНК БССР.

10. Даручыць Белсельбанку на працягу месяца падаць справаздачу аб скарыстаньні ў 1927-28 годзе фонду крэдытаваньня беднаты, прадугледжаную пастановай Эканамічнай Нарады пры СНК БССР за 27 студзеня 1928 году, зацьверджанай Саветам Народных Камісараў БССР 13-га лютага.

11. Запрапанаваць акруговым і райённым выканаўчым камітэтам месц сталы нагляд за работай сыстэмы сельска-гаспадарчага крэдыту, за выпіхненьнем усіх маючыхся ў яе рабоце недахопаў і за выкананьнем памянёных пастаноў Савету Народных Камісараў БССР, накіраваных на упарадкаваньне работы па скарыстаньню мэтавых прызначэньняў па сельска-гаспадарчаму крэдыту.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР С. КАРП.

Нам. Кіраўніка Справаў Савету Народных Камісараў БССР А. Дубавіцкі

13 сакавіка 1929 г.
г. Менск.

Разгортваньне малочнай справы БССР.

Агульная колькасьць малочных т-ваў у БССР на 1-га кастрычніка 1927 г. складала 156 аб'яднаньняў, а на 1-га кастрычніка 1928 г. 266 аб'яднаньняў,—павялічэньне на 70 проц. У працягу 1928-29 г. прадугледжваецца арганізаваць 144 новых аб'яднаньняў. Апроч гэтага, сёлета праводзіцца ўзбуйненьне малочных т-ваў шляхам пашырэньня дзейнасьці іх. У 1928 г. на адно т-ва прыпадала 107 пайшчыкаў і 182 каровы. Сёлета кожнае малочнае т-ва павінна ў сярэднім яднаць 195 пайшчыкаў і 310 кароў.

Некалькі заўваг адносна тэмпу ўцягненьня пайшчыкаў у малочную каапэрацыю. Да 1-га кастрычніка 1927 г. было каапэравана праз малочныя т-вы 11.242 гаспадаркі, ці 1,4 проц., а на 1-га кастрычніка 1928 г. было ўжо каапэравана 28.484 гаспадаркі ці 3,5 проц. У сёлетнім годзе мяркуецца каапэраваць 49.855 гаспадарак. Да канца гэтага году будзе каапэравана па ўсіх округах БССР каля 78.339 гаспадарак, ці 9,7 проц. усёй колькасьці сялянскіх гаспадарак. Колькасьць каапэраваных бядняцкіх гаспадарак павінна быць даведзена да 35-40 проц.

Адначасна з ростам ліку пайшчыкаў малочнай каапэрацыі ідзе паступны рост каапэраваных кароў. Калі на 1-га кастрычніка 1928 г. у малочных т-вах было 26.036 кароў, ці 2,8 проц., дык па пляну ў 1928-29 г. павінна быць каапэравана агулам каля 130.000 шт., ці 9,9 проц. усяго статку.

Зусім слушна, што ў сувязі з павялічэньнем ліку пайшчыкаў і кароў павялічваецца агульная колькасьць малака і лік прадпрыёмстваў па пераапрацоўцы сыравіны. У 1927-28 г. было 200 масла-сыраробных заводаў, а да канца 1928-29 г. павінна быць 344 прадпрыёмстваў па пераапрацоўцы малака. Летась было загатоўлена 18.000 тон малака, сёлета мяркуецца загатовіць 31.700 тон; з гэтай колькасьці 5000 тон суцэльнага малака для гарадоў будзе выраблена 800 тон масла і 650 тон сыру.

Для паляпшэньня інструктарскай працы ў малочных т-вах сёлета ў 3-х округах праведзены курсы масларобаў, а ў адной акрузе—курсы сыраробаў, праз якія было прапушчана каля 200 чалавек. На будучы час становіцца пытаньне, каб падрыхтоўка патрэбных у малочнай каапэрацыі спэцыялістаў праводзілася праз спэцыяльныя школы.

Адной з хібаў пастаноўкі нашага жывёлаводзтва зьяўляецца недахоп бугаёў, а ў сувязі з гэтым і вялікі процант ялавасьці кароў. У гэтым напрамку малочная жывёлаводная каапэрацыя прымае самыя рашучыя захады. Летась ва ўсёй сетцы малочнай каапэрацыі было толькі 42 злучных пунктаў з 44 бугаямі. Сёлета маюць быць арганізаваны 433 злучныя пункты. Частка бугаёў набываецца на мясцовым рынку. На гэту справу сёлета адпушчана 65.000 р. крэдыту. Для падрыхтоўкі патрэбнай колькасьці вытворнікаў праводзіцца кантрактацыя на гадаваньне бугаёў, як у межах БССР, так і на Ўкраіне. Галоўным чынам, зварачваецца ўвага на гадаваньне бугаёў чырвона-беларускага і чырвона-нямецкага гатункаў.

Прымаючы пад увагу немагчымасьць рацыянальнай пастаноўкі малочнай гаспадаркі і далейшага пасьпяховага развіцьця не бяз шырока-пастаўленай працы па корма-здабываньню, сёлета ўжываюцца адпаведныя захады ў гэтай галіне. Культура кораньплодаў павінна быць пашырана ў 30 проц. членаў малочнай каапэрацыі. Таксама робяцца захады да пашырэньня пасеваў кармавых траў. Для палепшаньня ўраджаю натуральных сенажацяў—сёлета праводзіцца кампанія за баранаваньне іх, выцярэбліваньне хмызьнякоў, зрэзваньне куп'я і г. д. Што-ж датычыцца пашырэньня спосабу квашаньня рознай зеляніны (сіласаваньне), дык з прычыны браку сродкаў гэта мерапрыёмства сёлета бадай ня будзе ажыццёўлена.

Сёньня ў клюбе Карла Маркса
ВЯЛІКІ ВЕЧАР НА КАРЫСЬЦЬ ДЗЯЦЕЙ ЗАХ. БЕЛАРУСІ.

Вечар гэты— 2-гі традыцыйны.
Прыгожая традыцыя!..

Працоўныя масы Савецкай Беларусі штодзень, што мінуту памятаюць аб сваім грамадзкім абавязку ў стасунку да прапоўных Беларусі Заходняй.

У гэтым сэнсе—жыцьцё рабочага і селяніна БССР прапякае падвойна: адно—тут, рэальнае,—ва ўпартым будаўніцтве сацыялізму, у бадзёрай барацьбе за лепшы быт, за ўздым гаспадаркі і культуры. Другое—там, думкамі і ўспамінамі—там, дзе панує цэмра прыгону і капіталу, дзе ня відаць пакуль што пробліску лепшае долі.

Але рабочы і селянін нашае вольнае рэспублікі Саветаў ня толькі думае ня толькі памятае аб сваіх заходня-беларускіх братох,

Ен ім дапамагае.

Сёньняшні вечар—адзін з этапаў гэтае дапамогі

Ня гледзячы на ўсю нашу занятасьць, на ўсю нашу перагружанасьць, мы ўсе будзем на гэтым вечары

Адзін раз у год—адзін дзень прысьвячаем мы цалкам «кветкам жыцьця бу дучага»—дзецям Заходняе Беларусі.

ДЫРЭКТЫВЫ ЭКАНОМНАРАДЫ НЯ ВЫКОНВАЮЦЦА.

Пастановай эканомнарады ад 27 верасьня 1928 г. было ўведзена абавязковае страхаваньне школ і бальніц, а таксама і іх рухомай маемасьці. У свой час на старонках «Савецкай Беларусі» мы азнаёмілі з асноўнымі правіламі і тэхнікай правядзеньня гэтага віду страхаваньня. Тады мы гаварылі і аб тым, што дзяржстрах праз страхавых райённых агентаў акажа дапамогу райвыканкомам у галіне ажыццяўленьня новага страхаваньня.

Як нам відома, дзяржстрах своечасова даў сваім мясцовым працаўнікам даручэньне дапамагчы райвыканкомам аформіць страхаваньне школ і бальніц, але, ня гледзячы на настойлівыя просьбы агентаў супольнымі сіламі правесьці ў жыцьцё гэты від страхаваньня яшчэ і дагэтуль у некаторых мясцох райвыканкомы не зварачваюць належнай увагі на гэту справу, і школы і бальніцы застаюцца незастрахаванымі.

Водгук апошніх вестак, у БССР налічваецца 16 райвыканкомаў, якія ня лічацца в постановай Эканомнарады і дагэтуль не страхуюць будынкаў вышэйпаказаных установаў. Відаць, у гэтых райвыканкомах існуе думка, што страхаваньне школ і бальніц—глупства і дробязь, на якую можна і не зварачваць увагі.

Між тым, па вестках Белдзяржстраху, у пэрыяд з 1 кастрычніка 1928 г. былі пажары ў 10 вясковых школах, за якія дзяржстрах выплаціў страхавой узнагароды 35000 р. у той час, калі ўсе страхавыя плацяжы за страхаваньне школ і бальніц па ўсёй БССР чакаюцца ў суме 50000 р.

З апошніх лічбаў мы бачым, што гэты від страхаваньня пабудаваны на такіх падставах, якія ні ў якім разе нельга лічыць цяжкімі для гаспадаркі асобных райвыканкомаў. Сапраўды, 10 кап. плацяжу з 100 руб. страхавой сумы за мураваныя будынкі, крытыя жалезам і 25 кап. за ўсе іншыя будынкі—зьяўляецца зусім не цяжкім для бюджэтаў райвыканкомаў.

Такім чынам, прычына ў незастрахаваньні школ і бальніц в іх рухомай маемасьцю заключацца, па нашай думцы, выключна ў нядбайнасьці і пасьвідомасьці працаўнікоў некаторых райвыканкомаў.

Трэба скончыць з такой нядбайнасьцю. Нашым акруговым выканаўчым камітэтам трэба яшчэ раз праверыць, што зроблена ў гэтай галіне райвыканкомамі. Трэба памятаць, што часа ня церпіць. Хутка надыходзіць цёплы час, калі пажарная небясьпека значна павялічыцца. Трэба прыняць рашучыя меры да таго, каб не засталося не застрахаванай ніводнай школы і бальніцы.

З.

ХРОНІКА.

ПРЫКЛАДНАЯ ВАЙСКОВАЯ КАСА АШЧАДНАСЬЦІ.

Каса ашчаднасьці пры № артылерыйскім дывізіёне была арганізавана ў сакавіку 1928 г.

За мінулы год працы гэта каса дасягнула значных посьпехаў: з 17 укладчыкаў на 1 красавіка 1928 г. з сумаю ўкладаў у 342 р. колькасьць укладчыкаў у сучасны момант узрасла да 351 укладчыка з укладамі на суму 6111 рублёў.

Начальніцкі склад звыштэрміновай службы ўцягнуты ў касу ашчаднасьці на 100 проц. Чырвоناармейцы і малодшы начальніцкі склад тэрміновай службы ахоплен на 57,6 проц.

Як вельмі важны фактар, трэба адзначыць дзейны ўдзел у рабоце па папулярызацыі і разьвіцьці ашчаднае справы як камандаваньня, так і партыйнай і камсамольскай арганізацыі часьці.

Поруч з гэтым заслугоўвае быць адзначанай і энэргічная работа вылучанага для работы па ашчаднай справе ў часьці т. Супярэкіна Ул. Ян.

Работа касы ашчаднасьці пры № артдывізіёне паказвае прыклад сур'ёзных адносін да задач фінансавае самаабароны і заслугоўвае перайманьня з боку многіх часьцей Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, у большасьці якіх ашчаднная справа разьвіта слаба.

НА БАРАЦЬБУ З РЭЛІГІЙНЫМІ СЬВЯТАМІ.

Яўрэйскія гаспадыні ня будуць сьвяткаваць вялікадня.

2-га красавіка ў клюбе Карла Маркса адбылася агульна-гарадзкая канфэрэнцыя працоўных яўрэйскіх жанчын усіх жантаў г. Менску. На канфэрэнцыю сабралася каля 900 чал., былі заслуханы даклады аб барацьбе з рэлігійным дурманам і аб адказе ад сьвяткаваньня вялікадня. Выступаўшыя адзначалі, што трэба адмовіцца ад сьвяткаваньня вялікадня, а сьвяткаваць толькі 1-га мая. Тыя грошы, якія трацяць на шану лепш аддаць на арганізацыю дзіцячых пляцовак і ясьляў, а таксама лепш афараваць іх на карысьць палітвязьняў у капіталістычных краінах.

Канфэрэнцыя школьнікаў.

Гэтымі днямі ў клюбе АВК адбылася канфэрэнцыя школьнікаў г. Менску. На канфэрэнцыі абмяркоўвалася пытаньне аб несьвяткаваньні вялікадня.

Школьнікі пастанавілі не сьвяткаваць вялікадня, а вучыцца ў гэтыя дні. Апроч гэтага, пастаноўлена арганізаваць гурткі бязбожнікаў, уцягнуўшы ў іх сваіх бацькоў і тых вучняў, якія ў іх ня ўцягнуты яшчэ.

ПЕРАГЛЯД ПРАВІЛ УНУТРАНАГА РАСПАРАДКУ.

У сувязі з працай па ўзмацненьню працоўнай дысцыпліны, Наркамправы БССР запрапанаваў усім прадпрыёмствам пераглядзець усе правілы ўнутранага распарадку.

Дагэтуль у правілах унутранага распарадку ёсьць яшчэ шэраг пунктаў, якія не адпавядаюць сучаснаму моманту і законадаўству. Напрыклад, ужо даўно ёсьць пастанова ўряду аб тым, што за прагулы ў працягу 3 дзён у месяц павінна ўжывацца звальненьне. Між тым некаторыя прадпрыёмствы («Витивой», «Чырвоная Бярэзіна» і інш.) дагэтуль кіруюцца даўно скасаваным палажэньнем аб дапушчэньні прагулаў да 6 дзён у месяц.

Некаторыя старыя правілы ўнутранага распарадку прадугледжваюць легалізацыю спазьненьняў нават да 15 хвілін (Папяровы і Скураны трэсты і інш). У новых правілах гэты пункт трэба зусім анішчыць, каб не дапускаць легальных спазьненьняў.

Гаспадарнікі прасілі пераглядзець правіл унутранага распарадку, якія павінны былі-б пераглядзеньні разам з перазаключэньнем калдагавору да 1 студзеня 1929 г.

Наркамправы запрапанаваў сваім органам на мясцох прасачыць за тым, каб правілы ўнутранага распарадку былі пераглядзены ў адпаведнасьці з сучаснай лініяй аб падвышэньні працоўнай дысцыпліны. Правілы павінны быць пераглядзены не пазьней 15 красавіка. Запрапанавана таксама прасачыць, каб правілы былі канкрэтныя і прыстасаваныя да ўмоў кожнага прадпрыёмства, каб у іх было ясна абгаворваны правы і абавязкі рабочага.

Падрыхтоўка да кампаніі лесаднаўленьня.

10-га красавіка пачынаецца месячнік кампаніі лесаднаўленьня. Апрача школьнай моладзі і камсамолу сёлета будуць шырока ўцягнуты ў гэту кампанію арганізацыі ТДА-Аніяхіму.

Радыё-вузлы.

Віцебскі акрпрафаддзел заключыў дагавор з з беларускай округай сувязі аб пабудове ў Віцебску вялікай трансьляцыйнай станцыі. Пабудова гэтай станцыі будзе каштаваць 70.000 руб. і павінна быць закончана да 1-га мая.

Гэткая-ж радыё-станцыя будзе пабудавана і ў Бабруйску.

Канфэрэнцыя скончыўшых Менскі белпэдтэхнікум.

Менскі беларускі пэдтэхнікум у канцы навучальнага году наладжвае канфэрэнцыю, на якую склікае ўсіх скончыўшых гэты пэдтэхнікум. Канфэрэнцыя абгаворыць шэраг пытаньняў, маючых сувязь з практычнай працай былых студэнтаў пэдтэхнікуму на мясцох.

Побач з гэтым пэдтэхнікум наладжвае кансультацыю для аказаньня дапамогі ў практычнай працы сваіх былых студэнтаў.

Тыднёвік чыстаты.

Акруговая інспэкцыя аховы працы супольна з акруговым камітэтам «Чырвонага Крыжу» з 14 да 21 красавіка маюць правесьці тыднёвік чыстаты. У часе тыднёвіка сіламі грамадзкіх арганізацый будзе праводзіцца абсьледаваньне санітарнага становішча прадпрыёмства, устаноў грамадзкага карыстаньня і дамаўладаньняў. Да правядзеньня тыднёвіка чыстаты прымяваюцца вучні школ, піянэры і студэнцтва.

Аўтатрактарныя курсы.

13-га красавіка пры менскай аб'яднанай прафтэхшколе арганізуюцца аўтатрактарныя курсы. Тэрмін навучаньня на курсах—3 месяцы.

Удзел асьветнікаў у вярбоўцы ў вайсковыя школы.

У сувязі з разгортваньнем вярбовачнай кампаніі па набору маладняка ў вайсковыя школы, Наркамасьветы і ЦП саюзу асьветнікаў далі мясцом дырэктывы зараз-жа ўстанавіць шчыльную сувязь з вярбовачнымі камісіямі. Мясцовыя органы нарасьветы і саюзу павінны аказаць вярбовачным камісіям садзейічаньне ў правядзеньні кампаніі, асабліва ў справе падрыхтоўкі рабочых, батракоў і беднякоў па агульна-адукацыйных прадметах.

Запрапанавана ў гарадох і райённых цэнтрах арганізаваць пры адной з школ вячэрнія агульна-адукацыйныя курсы. Рабочыя, батракі і беднякі-адзіночкі будуць прымацоўвацца да аднаго з настаўнікаў бліжэйшай школы.

У хатах-чытальнях і пардамох будуць праводзіцца сваёдзіньныя гутаркі, ухваляцца выстаўкі літаратуры і выдавацца спэцыяльныя нумары насьценгазэты.

Зацьверджан плян вапнаваньня глебы.

Эканомнарада зацьвердзіла плян Наркамзему на вапнаваньню глебы ў бягучым годзе. Паводле пляну, 5000 гэктараў будзе вапнавана ўлетку і 20.000 гэкт. увосень. Будзе набудавана па БССР 63 вапняных млыноў, устаноўка якіх даручана сельскагаспадарчым таварыствам.

Вапнаваньне глебы сёлета мяркуецца правесьці, галоўным чынам, у Менскім, Бабруйскім, Магілёўскім і частны Аршанскім. Для папулярызацыі вапнаваньня будзе праведзена закладка паказальных вучасткаў у саўгасах, калгасах, вопытных балотных пунктах і ў сялян-дасьледчыкаў. Наогул на БССР такіх вучасткаў будзе закладзена 1200.

Падрыхтоўка да будаўніцтва дзяржаўнай бібліятэкі.

Менскі камгас праводзіць ацэнку дамоў на рагу вуліц Энгельса і Карла Маркса. У сувязі з будаўніцтвам на іх месцы дзяржаўнай бібліятэкі камгас ставіць пытаньне перад Наркамасьветы, каб апошні аплаціў вартасьць гэтых дамоў, каб зараз-жа распачаць на гэтыя сродкі будаўніцтва новых дамоў для кватарантаў, якія займаюць дамы, падлягаючыя зносу.

У менскіх установах кульгае працоўная дысцыпліна.

Па ініцыятыве Бюро Скаргаў НК РСІ БССР гэтымі днямі было праведзена масавае абсьледаваньне савецкіх і каапэрацыйных устаноў Менску. Абсьледаваньне праводзілася для выяўленьня, як працаўнікі ўстаноў адносяцца да наведвальнікаў, парадку прыёму і працоўнай дысцыпліны сярод працаўнікоў установы.

У абсьледваньні ўдзельнічала 30 чалавек, якія праверылі цэлы шэраг устаноў Наркамзему, Нар. Кам. Сацыяльнай Забясьпекі, Наркампрацы, Наркамфіну і каапэрацыі ўсіх відаў.

Абсьледаньне дало надзвычайна багаты матар'ял, з якога відаць, што ў большасьці ўстаноў працоўная дысцыпліна пакідае жадаць шмат лепшага. Гутаркі ў часе працы паміж працаўнікамі, вандраваньне з пакою ў пакой, ад стала да стала, чытаньне у часе працы газэт, часопісаў і іншыя ненармальныя зьявішчы досыць часта можна бачыць у нашых савецкіх і каапэрацыйных установах.

Амаль нідзе прыём наведвальнікаў адказнымі працаўнікамі не ўрэгуляваны.

Адчуваецца, што на мясцох змагаюцца з дробным бюракратызмам, а буйнага не прыкмячаюць, разважаючы, што гэта «мол» свой хлапец.

З матар'ялаў абсьледваньня відаць, што ў Белсельсаюзе працаўнікі ў часе заняткаў займаюцца манікюрам і вандраваньнем з пад'аддзелу ў пад'аддзел бяз ніякай мэты, а ў гэты час вельмі важныя ордэры з водпускам матар'ялаў валяюцца па 2 тыдні ў канцэляры. У гандлёвым аддзеле няўважліва адносяцца да наведвальнікаў.

У Менскім акрэа пануе валакіта. У часе абсьледаваньня якраз быў селянін, які 2 гады вандруе па сваёй справе і ўсё ня можа дабіцца толку. Абсьледавацель быў сьведкай, як гэтага селяніна працаўнік Філіповіч паспаў да рэгістратара, рэгістратар да інспэктара, а той кажа: «я заняты і шукаць вашай справы ня буду".

У акр. аддзеле сац. забясьпекі працаўнікі вельмі груба адносяцца да наведвальнікаў. Не адстаюць ад іх і адказныя працаўнікі Наркамсабесу.

Сэкратар гарсавету Пасынкоўскі выявіў да абсьледавацеляў надзвычайна бюракратычныя адносіны.

Тыя пытаюцца аб кватэры, а Пасынкоўскі належна ня выслухаўшы іх кажа: «ідзеце ў жылстол, бо я тут парад не даю».

— Нам,—кажуць абсьледавацелі,—кватэра патрэбна тэрмінова, а ў жылстале прыдзецца чакаць 3 гады.

— Ну, і чакайце...

— Дзе, на вуліцы?

— Так, на вуліцы,—пачуўся „разумны" адказ Пасынкоўскага.

Працаўнікі страхкасы пасьля прыходу на працу шмат часу трацяць на гутаркі і на вандраваньне па ўстанове.

Рэгістратар страхкасы не адкажа наведвальніку, пакуль не прачытае артыкул у часопісу.

У Акрфа вялікія аматары весьці вясёлыя гутаркі. Абсьледвацелі засталі малюнак, што каля аднаго стала зьбіраецца 5-6 супрацоўнікаў і пад гутарку весела рагочуць, а справа... не ўцячэ...

У шмат якіх крамах ЦРК прыказчыкі ў часе працы размаўляюць з знаёмымі пакупцамі, а ў гэты час народ чакае водпуску тавараў.

У Менскім камгасе дагэтуль ня ўрэгулявана пытаньне з прыёмам наведвальнікаў, і апошнім прыходзіцца шмат часу траціць даремна на чаканьне таго або іншага адказнага працаўніка.

У Белкустпрамсаюзе ў часе абсьледаваньня было шмат народу, а супрацоўнікі гэтай установы жартавалі з поваду 1 красавіка.

На менскай біржы працы да загадчыка папасьці вельмі цяжка. Абсьледавацель з наўгадзіны стукаў у дзьверы, пакуль яго ўпусьцілі ў габінэт да начальства. Пры абсьледаваньні біржай працы беспрацоўных наглядаецца вялікая валакіта: некаторыя беспрацоўныя па 3 разы запаўняюць анкеты, а абсьледаваньне ў іх усё яшчэ ня зроблена.

У заключэньне трэба сказаць, што праведзенае абсьледаваньне дало вельмі багаты матар'ял. Яно паказала слабыя месцы ў працы нашых дзяржаўных і каапэрацыйных апаратаў, а гэта дасьць магчымасьць выправіць і зьнішчыць усе недарэчнасьці і недахопы.

З лістоў рабселькораў

АРГАНІЗАВАЛІ НАСЕННАВОДНАЕ ТАВАРЫСТВА.

Распачынаючы ачыстку збожжа, сяляне в. Карышкава сустрэліся з цяжкасьцю працы, бо трэба было ехаць у сельсавет за 6-7 кілёмэтраў каб ачысьціць сваё насеньне. Пад кіраўніцтвам райагранома сяляне знайшлі добры выхад, арганізаваўшы насеннае таварыства. Зараз у вёску прывезьлі в сельсавету трыер і выпісалі яшчэ некалькі машын. Таксама абралі кіраўніка таварыства. Плата за ачыстку збожжа наступная: бяднейшай частцы сялянства—дармова, а в сераднякоў бярэцца па 5 к. з пуда. Сяляне гэтым надта здаволены.

П. Д.

БЫЛЫ СПЭКУЛЯНТ—НА ЧАЛЕ ЗАГАТОВАК.

Праўленьне Пухавіцкага спажывецкага таварыства ўзяло на працу па хлебазагатоўцы былога спэкулянта Марона Ліпу, пазбаўленага выборчых правоў. Аднойчы Марон Ліпа быў настаўлен працаваць у мануфактурны аддзел. Калі туды прышла бяднячка Пінхасік за таварам, дык Марон, адпускаючы тавар, ударыў яго на руках і адагнаў ад прылаўку.

Камсамолец.

«ПАЧАКАЙЦЕ, ВЫРАСТУЦЬ ЯБЛЫКІ»...

У сьнежні мін. г. сяляне м. Крушылаўкі вазілі апал Жыліцкому саўгасу, зараз яны ходзяць за атрыманьнем платы, але ніяк ня могуць атрымаць. На просьбу сялян аб аплаце загадчык саўгасу кажа: «пачакайце, вырастуць яблыкі ды капуста—тады аплацім». Сяляне хадзілі, хадзілі ды, нарэшце, махнуўшы рукой, супакоіліся.

Селькор Міхайлаў.

ТРЭБА АБСЛУГОЎВАЦЬ І ВАКОЛІЧНЫЯ ВЁСКІ.

Каля вёскі Гарочыца праходзіць Заходняя чыгунка, маецца чыгуначная станцыя „Гарочыцы" і лесапільны завод.

Кожны тыдзень на завод прыяжджае доктар для аказаньня медыцынскай дапамогі рабочым і служачым. Таксама прыяжджае доктар Заходняй чыгункі і аказвае дапамогу рабочым і служачым чыгункі. Гэтыя дактары адмаўляюцца аказваць дапамогу сялянам ваколічных вёсак.

Мазырскаму Акрздраву неабходна арганізаваць медпапамогу так, каб гэтыя дактары абслугоўвалі і сялян суседніх вёсак.

Ляпенік.

З-ЗА КЕПСКАГА ЛІСТАНОСЦА—МАЛА ПАДПІСЧЫКАЎ.

У вёску Альхоўку, Уваравіцкага райёну, пошту дастаўляе лістаносец Вазовікаў.

У першыя дні Вазовікаў дастаўляў пошту досыць добра, сяляне выпісвалі шмат газэт і іншай літаратуры. Зараз Вазовікаў не дастаўляе лістоў і газэт сялянам. У выніку гэтага паменшылася падпіска на газэты.

Трэба Ўраравіцкаму паштовому аддзяленьню зьвярнуць на гэта ўвагу.

Селькор.

ЯК РВК МЯРКУЕ СКАРЫСТАЦЬ СРОДКІ САМААБКЛАДАНЬНЯ?

Па так даўно сельсаветы Рагачэўскага раёну (Бабруйская округа) атрымалі загад ад РВК аплаціць наём памяшканьняў пад школы і купіць апал для школ за сродкі з самаабкладаньня. Сяляне супроць гэтага, і патрабуюць, каб сродкі самаабкладаньня выкарыстоўваліся на мэты, вызначаныя агульным сходам.

Я. Крушына.

ВАЛАКІТА З ВЫДАЧАЙ ЛЕСУ.

Жаўвінецкая сельлескамісія, Бабруйскай акругі, разьмеркавала атрыманы лес сярод сялян. Склала сьпісы, у якіх адзначыла суму кошту прызначанага лесу, колькі плаціць падатку. Сьпісы былі зацьверджаны РВК і накіраваны ў Броскае лясьніцтва.

Калі сяляне зьявіліся ў лясьніцтва, каб атрымаць лесарубачныя білеты, дык лясьнічы адаслаў іх назад у сельсавет за справкамі, колькі плацяць падатку. Сяляне даставілі гэтыя справкі, але лясьнічы зноў іх адаслаў даставіць справкі аб нумарох замацаваных дрэў. Сяляне даставілі і гэтыя справкі, але лясьнічы зноў запатрабаваў даставіць войкіх сьпісаў з сельсавету. У выніку сяляне хадзілі некалькі разоў туды і назад за 25 вёрст, а лесу не атрымалі.

Селянін.

СКІДКІ—СВАЯКОМ.

Начова абраны старшыня Асоўскага с-с. Бягомльскага райёну, як толькі прыступіў да працы, пачаў шчыра клапаціцца аб сваіх кумох і сваякох. У лютым была прадастаўлена Асоўскаму сельсавету скідка па страхоўцы. Старшыня сельсавету Скакун даў першую скідку сваёму швагеру Палітыку, які мае добрую гаспадарку і наёмную батрачку, а другую скідку прадаставіў другому швагру, таксама моцнаму гаспадару, ня гледзячы на тое, што ў Асоўскім с-с. ёсьць шмат бедноты, якія ня маюць сродкаў каб выплаціць страхоўку поўнасьцю.

П. В.

КІНО.

„ПРАДАНЫ АПЭТЫТ".
(„Пралетары").

Кіно-памфлет „Прадан